

Пытанне, дзе ўзяць рабочыя рукі, становіцца для беларускай эканомікі ўсё больш актуальным. Летась паказчыкі прыёму не змаглі выканаць прафтэхустановы сталіцы, Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей.

СТАР. 2



Яго дапамога патрэбна адзінокім старым людзям. Два разы на тыдзень ён набывае ў аўтакраме і прывозіць ім неабходныя прадукты, прыносіць брыкет і дровы, ваду. Робіць усё, што трэба па гаспадарцы.

СТАР. 3



З ініцыятывы Васіля Купрэвіча ў сістэме Акадэміі навук БССР былі створаны інстытуты, якія сталі флагманамі беларускай навукі: фізікі, матэматыкі, ядзернай энергетыкі, генетыкі і цыталогіі і інш.

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 САКАВІКА 2012 г. СЕРАДА № 48 (27163) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАТРАБУЕ ПАВЫСІЦЬ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ВЫКАРЫСТАННЯ СРОДКАЎ ІНАВАЦЫЙНЫХ ФОНДАЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка патрабуе павысіць эфектыўнасць выкарыстання сродкаў інавацыйных фондаў. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора на нарадзе па пытанні фарміравання такіх фондаў, перадае БЕЛТА.**

Як адзначыў Прэзідэнт, урад унёс прапановы па фарміраванні і напрамках выкарыстання інавацыйных фондаў. «Гэта пытанне няпростае, па яго вырашэнні ёсць шмат пунктаў гледжання. Таму трэба выпрацаваць найбольш аптымальны і эфектыўны падыход. Вядома ж, у аснове будуць ляжаць агульнадзяржаўныя інтарэсы і прыярытэты развіцця нашай дзяржавы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што калі ў 1996 годзе пачалося фарміраванне інавацыйных фондаў, галоўнай іх мэтай было стымуляваць укараненне ў вытворчасць дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, выпуск навукаёмістай прадукцыі. Канцэнтрацыя фінансавых сродкаў у галінах прадугледжвала магчымасць накіроўваць іх на найбольш перспектыўныя праекты і важныя дзяржаўныя праграмы. «У апошнія гады інавацыйнае развіццё з'яўляецца адным з нашых прыярытэтаў. Гэтыя мэтавыя бюджэтныя фонды павінны ў поўнай меры служыць актыўнай рэалізацыі гэтага напрамку».

Аднак, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, сур'ёзны аналіз рэальнай сітуацыі з фарміраваннем і выкарыстаннем інавацыйных фондаў у галінах эканомікі выяўляе шэраг тэндэнцый. Па-першае, з году ў год скарачаецца колькасць прадпрыемстваў, якія ўносяць у іх свае адлічэнні. Калі ў 2009 годзе агульная колькасць арганізацый-плацельшчыкаў складала больш як 25 тыс. (уключаючы сферу гандлю), то ў 2011 іх засталося ў дзесяць разоў менш. А на 2012 год яшчэ прапануецца іх скараціць. Па-другое, скарачаецца доля інавацыйных фондаў у валавым унутраным прадукце. У 2011 годзе яна складала 0,7 працэнта супраць амаль 2 працэнтаў у 2009 годзе.

Па-трэцяе, усё меншая частка гэтых фондаў ідзе на фінансаванне інавацый. Так, у 2010 годзе больш як 50 працэнтаў сродкаў было накіравана на фінансаванне капітальных укладанняў, а на навукова-даследчыя работы і рэалізацыю дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця — толькі 11 працэнтаў. Прыкладна такая ж карціна была і ў 2011 годзе.

«Незразумелая ў даным выпадку пазіцыя ўрада: эфектыўнасць выкарыстання сродкаў мэтавага фонду падае, а дзейсных мер па паляпшэнні сітуацыі не прымаецца. Да таго ж ёсць нямала фактаў распылення сродкаў і недапушчальнага іх транжырства. Тут, вядома, поле дзейнасці Камітэта дзяржаўнага кантролю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«У сувязі з гэтым заканамерна паўстае пытанне: ці аптымальны існуючы метад фарміравання фондаў? Ці не атрымаецца так, што ўвесь груз ляжа толькі на дзяржаўныя прадпрыемствы? Хоць інавацыйнае абнаўленне — найважнейшая задача для ўсіх, нягледзячы на форму ўласнасці. Ці можна лічыць справядлівым збор і размеркаванне сродкаў інавацыйных фондаў? І галоўнае — што трэба зрабіць для павышэння іх эфектыўнай аддачы?» — такія пытанні перад удзельнікамі нарады паставіў кіраўнік дзяржавы, запатрабаваўшы дакладных і дзелавых адказаў. Інавацыйныя фонды ў Беларусі фарміруюцца з 1996 года. З 2005 года інавацыйным фондам прысвоены статус мэтавых бюджэтных фондаў з уключэннем іх у склад рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## «ІНТЭРНЭТ-КАВЯРНЯ» ў сталічным парку валуноў

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Эдуард НІКІЦІН, начальнік Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі крымінальнай міліцыі МУС Беларусі:**

***«З нелегальнага абарачэння ў 2011 годзе было выключана 5 чыгуначных цыстэрнаў па 60 тыс. л прадукцыі з утрыманнем спірту і алкагольнай на Br4 млрд. Гэта амаль эшалон, калі сабраць разам, што ў два разы больш у параўнанні з 2010-м».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.03.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8200,00 | ▲ |
| Еўра | 10800,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 278,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1022,25 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 7° |
| Віцебск | + 2° |
| Гомель | + 2° |
| Гродна | + 4° |
| Магілёў | + 1° |
| Мінск | + 3° |

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

## МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ ЗАПАТРАБАВАЎ ДЫВЕРСІФІКАВАЦЬ РЫНКІ ЗБЫТУ БЕЛАРУСКАЙ ХАРЧОВАЙ ПРАДУКЦЫІ

**Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч запатрабаваў дыверсіфікаваць рынкі збыту беларускай харчовай прадукцыі. Аб гэтым ён заявіў учора на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна, дзе разглядаліся вынікі выканання ў 2011 годзе дзяржпраграмы ўстойлівага развіцця вёскі на 2011-2015 гады, перадае БЕЛТА.**

Кіраўнік урада адзначыў, што большасць харчовых тавараў (89 працэнтаў) Беларусі рэалізуецца на расійскім рынку, 6 працэнтаў — у іншых краінах СНД і толькі 5 працэнтаў — за межамі краін Садружнасці. «Структура экспарту, шчыра кажучы, няважная, — канстатаваў ён. — Неабходна дыверсіфікаваць рынкі, каб актыўна працаваць і ў іншых краінах». Міхаіл Мясніковіч нагадаў, што Расія прыняла дактрыну харчовай бяспекі. У адпаведнасці з гэтым дакументам на працягу бліжэйшых гадоў плануецца вырашыць пытанні па забеспячэнні ўнутранага рынку гэтай краіны мясам птушкі і свінінай. «Трэба гэта ўлічваць, інтэгравацца з расійскімі вытворцамі, гэтак жа як і з казахстанскімі калегамі», — заявіў прэм'ер-міністр.

Ён таксама нагадаў, што да канца пяцігодкі сельская гаспадарка краіны павінна выйсці на аб'ёмы экспарту прадукцыі ў памеры $7,2 млрд і дасягнуць у 2015 годзе дадатнае сальда знешняга гандлю $4 млрд з улікам спажывецкага прамежкавага і інвестыцыйнага імпарту па ўсіх суб'ектах гаспадарання па гэтай групе тавараў.

У 2011 годзе арганізацыямі галіны экспартавана прадукцыі на $4,1 млрд пры заданні $3,7 млрд. Знешнегандлёвае сальда склала $734 млн, што таксама вышэй за заданне.

■ Абітурыент-2012

## ДВА ТЫДНІ ТЭСТАВЫХ ІСПЫТАЎ

**Як паведамляе прэс-служба Міністэрства адукацыі, у Беларусі зацверджаны графік правядзення ў 2012 годзе цэнтралізаванага тэсціравання.**

Традыцыйна ЦТ стартуе са здачы абітурыентамі тэста па беларускай мове (13 чэрвеня). 14 чэрвеня абітурыенты будуць здаваць рускую мову, 16 чэрвеня — біялогію, 17 чэрвеня — матэматыку, 19 чэрвеня — грамадазнаўства, 20 чэрвеня — хімію, 21 чэрвеня — сусветную гісторыю найноўшага часу, 23 чэрвеня — фізіку, 24 чэрвеня — гісторыю Беларусі, 26 чэрвеня — замежныя мовы і 27 чэрвеня — геаграфію. Рэгістрацыя для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні распачнецца 2 мая і будзе доўжыцца да 1 чэрвеня ўключна.

Для абітурыентаў, якія па ўважлівай прычыне прапусцілі цэнтралізаванае тэсціраванне ў асноўны дзень, прадугледжаны рэзервовы дзень — 4 ліпеня. Але здаць у рэзервовы дзень можна будзе толькі адну дысцыпліну. Пунктамі рэгістрацыі абітурыентаў для ўдзелу ў ЦТ у рэзервовы дзень вызначаны Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. Сухога, Беларуска-Расійскі ўніверсітэт і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні ў рэзервовы дзень трэба будзе звярнуцца ў гэтыя ВНУ з 27 чэрвеня па 1 ліпеня для рэгістрацыі. Пунктам правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па ўсіх вучэбных прадметах у рэзервовы дзень стане Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

## ЕДЗЕМ НА «ЛЯТУЧКУ»

95 ЗВЯЗДА

**Заўтра рэдакцыя «Звязды» распачынае новы творчы праект пад назвай «Вялікая чытацкая «лятучка», накіраваны на павелічэнне колькасці прыхільнікаў старэйшага беларускамоўнага выдання, якому сёлета ў жніўні споўніцца 95 гадоў.**

Сустрэча з цяперашнімі і патэнцыяльнымі падпісчыкамі і проста добрымі людзьмі плануецца ў горадзе Ляхавічы ў актавай зале райвыканкама. Яе пачатак запланаваны на 15.00. Мяркуецца, што пры самым плённым садзейнічанні кіраўніка раённай «вертыкалі» Дзмітрыя Міхайлавіча Бурдука, начальніка раённага вузла паштовай сувязі Вольгі Мікалаеўны Арэхвы звяздоўскі дэсант на чале з галоўным рэдактарам не толькі раскажа ўдзельнікам сустрэчы пра здабыткі «Звязды», якая на працягу многіх гадоў з'яўляецца носьбітам айчыннай культуры, але і пра дзень сённяшні.

У выязной праграме — выставы фотакарэспандэнта «Звязды» Яўгена Пясецкага і мастака часопіса «Вожык» Аляксандра Каршакевіча. Сярод тых, хто падпішацца на «Звязду», будзе праведзена латарэя з розыгрышам каштоўных рэчаў. Памятнымі прызамі будуць адзначаны і тыя, хто праявіць актыўнасць у веданні гісторыі старэйшага беларускамоўнага выдання.

Да сустрэчы!

## МІЛІЦЫЯ ШУКАЕ «ЖАРТАЎНІКА», ЯКІ ПАСТАВІЎ НА ВУШЫ СТАЛІЧНЫ ВАКЗАЛ

Мінская міліцыя шукае «жартаўніка», які паставіў на вушы сталічны вакзал, паведаміў БЕЛТА прэс-сакратар УУС на транспарце Аляксандр Марчанка.

Ужо вядома, што аб мініраванні вакзала 12 сакавіка ў 20.17 паведаміў па тэлефоне нейкі мужчынскі голас. Праваахоўнікі ўстанавілі, што быў выкарыстаны тэлефон-аўтамат на трэцім паверсе вакзала. Пошукі «мінёра» прадаўжаюцца, транспартная міліцыя просіць усіх, хто можа дапамагчы ў высвятленні асобы званіўшага, паведаміць па тэлефоне 102. У адносінах да невядомага ўжо заведзена крымінальная справа па ч.1 арт.340 КК Беларусі (Ілжывае паведамленне аб падрыхтоўцы выбуху).

Пасля паведамлення аб мініраванні да вакзала былі сцягнуты група мініравання, экіпажы МНС і хуткай дапамогі. З будынка былі эвакуяваны амаль 700 чалавек — работнікі вакзала, пасажыры. У мэтах бяспекі рух цягнікоў быў часткова абмежаваны, саставы з 1-га і 2-га пуцей адпраўляліся далей ад будынка, на 3-і і 4-ы пуці. Ніякіх падазроных прадметаў, зрэшты, спецыялісты не знайшлі, і ў 21.40 вакзал пачаў працаваць у штатным рэжыме.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### Я — ГРАМАДЗЯНІН БЕЛАРУСІ

**Першы ў жыцці пашпарт маладыя жыхары Віцебска змогуць атрымаць з рук губернатара вобласці.**

Акцыя Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «Мы — грамадзяне Беларусі!» прысвечана Дню Канстытуцыі. А таму з 14 па 16 сакавіка ў трох раёнах Віцебска пройдуць тэматычныя мерапрыемствы. Плануецца, што 15 сакавіка ў абласной філармоніі старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец на ўрачыстай цырымоніі, прысвечанай Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, уручыць першы ў жыцці пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь 16-гадовым актывістам БРСМ Віцебшчыны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ЗАНІЗІЛІ ЦАНУ

**Супрацоўнікі КДБ выявілі факт злоўжывання паўнамоцтвамі з боку службовых асоб ААТ «Лідскія аўтобусы «Нёман», паведамляе прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.**

Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў высветлена, што намеснік дырэктара і начальнік аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і камплектацыі гэтага прадпрыемства па папярэдняй змове рэалізавалі сталічнаму індывідуальнаму прадпрымальніку 20 абагравальнікаў «Hydronic» да аўтобусаў па заніжанай цане. На рахунак ААТ пакупнік пераве́ў 52 мільёны рублёў, а для службовых асоб, якія садзейнічалі выгаднаму набыццю камплектуючых, перадаў канверт з загадзя абумоўленым узнагароджаннем. У выніку прадпрыемству прычынены страты ў буйным памеры.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### ЗНОЎ МОКРЫ СНЕГ

Сёння і ў чацвер на тэрыторыю краіны завітае больш халоднае паветра з поўначы Еўропы, месцамі пройдзе мокры снег. 15 сакавіка ўдзень на захадзе магчымы дождж. На дарогах галалёдзіца. Захаваецца моцны парывісты вецер да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы мінус 1—8 градусаў, удзень — ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, на паўднёвым захадзе — да 7 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### САРКАЗІ АБВІНАВАЦІЛІ Ў ТЫМ, ШТО ЁН УЗЯЎ У КАДАФІ 50 МЛН ЕЎРА НА ПЕРАДВЫБАРНУЮ КАМПАНІЮ



Прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі, які збіраецца балатавацца на другі тэрмін, зноў абвінавацілі ў тым, што яго перадвыбарную кампанію ў 2007 годзе фінансаваў звергнуты і забіты мінулай восенню лівійскі лідар Муамар Кадафі. Кіраўнік французскай дзяржавы з абурэннем назваў такія паведамленні смяхотнымі. Спекуляцыі на гэтую тэму ўспыхнулі з новай сілай пасля таго, як у панядзелак незалежнае інфармацыйнае агенцтва Mediapart апублікавала дакумент, у якім гаворыцца, што Кадафі нібыта перадаў Сарказі на яго перадвыбарную кампанію 50 мільёнаў еўра. У запісцы, атрыманай інтэрнэт-сайтам Mediapart з уласных крыніц, у прыватнасці, паведамляецца, што перамовы аб фінансаванні кампаніі праходзілі з удзелам сына Кадафі.

### ЛІТОЎСКАЯ АПАЗІЦЫЯ ВЫСТУПІЛА ЗА ДАТЭРМІНОВЫЯ ВЫБАРЫ

Прадстаўнікі апазіцыі ў Сейме Літвы выступілі за правядзенне датэрміновых парламенцкіх выбараў, паведамляе Delfi.lt. Яны лічаць, што ўрад перажывае крызіс і што гэты крызіс распаўсюджваецца і на заканадаўчы орган. Раней пра магчымасць датэрміновых выбараў заявіла спікер парламента Ірэна Дэгутэне. Каментуючы канфлікт унутры кіруючай кааліцыі (звязаны са звальненнем кіраўніцтва Службы расследавання фінансавых злачынстваў), яна выказала меркаванне, што палітычнае супрацьстаянне выльецца ў хвалю інтэрпеляцый (галасаванняў аб даверы міністрам) і што нармальна працаваць у такіх умовах Сейм не зможа.

### РЭЙТЫНГ АБАМЫ ЗНІЗІЎСЯ ДА ГІСТАРЫЧНАГА МІНІМУМУ

Такія вынікі апытання, праведзенага па замове New York Times і CBS News, паведамляюць інфармагенцтвы. Дзейнасць прэзідэнта ўхваляюць толькі 41% амерыканцаў. Гэта самы нізкі вынік за ўвесь час правядзення гэтага апытання з моманту ўступлення Абамы на пасаду прэзідэнта ў 2009 годзе. Яшчэ ў лютым гэты паказчык складаў 50%. Плюс да ўсяго, каля 50% рэспандэнтаў адзначылі, што не задаволены працай Абамы. Негатыўна ацэньваюць працу прэзідэнта 47% амерыканцаў. Не вызначыліся 12%.

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## У ЛАТВІІ ЛІЧАЦЬ, ШТО САНКЦЫІ ЕС У ДАЧЫНЕННІ БЕЛАРУСІ НЕ ДАСЯГНУЦЬ ПАСТАЎЛЕНЫХ МЭТ



Латышскае нацыянальнае аб'яднанне Visu Latvijai! — ТБ/ДННЛ лічыць, што санкцыі супраць Беларусі не дасягнуць пастаўленых мэт, паведамляюць інфармагенцтвы. У арганізацыі лічаць, што санкцыі сур'ёзна пашкодзяць эканоміцы Латвіі, бо Беларусь для краіны з'яўляецца другім найбуйнейшым партнёрам за межамі Еўрасаюза. Гэта ў найбольшай меры закране транзіт, парты Латвіі, экспарт і ўсіх тых прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць беларускую сыравіну ў вытворчасці.

Аб'яднанне заклікае прэм'ер-міністра Латвіі Валдзіса Дамброўскіса знайсці рашэнне для таго, каб планаваныя санкцыі не былі ўжыты ў дачыненні да Беларусі.

### КОРАТКА

Беспрацоўных жанчын на 1 сакавіка гэтага года налічвалася ў Беларусі больш як 15,9 тыс., паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. За студзень гэтага года колькасць жанчын, якія маюць статус беспрацоўных, узрасла на 0,6 тыс. чалавек, за люты — на 0,1 тыс. (за снежань 2011 года іх стала менш на 0,7 тыс.). Паводле слоў спецыялістаў, такая тэндэнцыя абумоўлена сезоннымі ваганнямі на рынку працы.

Цэнтр дапамогі нарказалежным адкрыецца ў Салігорску ў першым паўгоддзі бягучага года. Аб гэтым паведамілі ў дэпартаменце грамадскай інфармацыі ААН у Беларусі. У 2011 годзе ў рамках рэалізацыі гранта Глабальнага фонду для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам, малярыяй (ГФ) Праграмай развіцця ААН быў праведзены конкурс на арганізацыю цэнтра псіхасацыяльнай дапамогі наркаспажыўцам у адным з гарадоў Беларусі з найбольшым распаўсюджваннем наркаманіі. Пераможцам конкурсу стала Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Маці супраць наркотыкаў». У цэнтры змогуць атрымаць дапамогу наркаспажыўцы, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю. Пры неабходнасці іх будуць кансультаваць спецыялісты медыцынскага і сацыяльнага профілю.

## ЦІ ЗМАГЛІ Б ВЫ АДНОЙЧЫ РАНІЦАЙ ПРАЧНУЦЦА І ПАЧАЦЬ РАЗМАЎЛЯЦЬ ВЫКЛЮЧНА ПА-БЕЛАРУСКУ І НАЗАЎСЁДЫ?



**Ігар ТУР, рэдактар дырэкцыі інфармацыйнага і грамадска-палітычнага вяшчання Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё:**

— Тут дваістае пытанне: з аднаго боку, ці гатовы я тэхнічна перайсці на беларускую мову? Гэта для мяне будзе зрабіць вельмі проста, бо ў сваёй працоўнай дзейнасці я выкарыстоўваю менавіта беларускую мову. А з другога боку, калі казаць пра маральны план, то мяркую, што я не змагу сябе ўтульна адчуваць у наваколлі, калі буду размаўляць выключна па-беларуску. Праўда, апошнім часам сітуацыя мяняецца ў лепшы бок, таму буду спадзявацца, што калі-небудзь я змагу поўнасцю перайсці на родную мову.



**Раман БРОДАЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення знешняй эканамічнай палітыкі Міністэрства эканомікі:**

— Я б вельмі хацеў размаўляць па-беларуску. Бо я беларус, я адчуваю сябе грамадзянінам гэтай краіны і разумею, што гэта мая родная мова. Але ў любой справе патрэбна практыка і вопыт. Гэта павінна быць правільна, прыгожа, гэта павінна быць часткай жыцця, складам думак. Але чыста тэхнічна праблем, каб гэта зрабіць, няма.



**Вячаслаў ДОЎНАР, генеральны дырэктар ААТ «Белінтэртранс», член Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь :**

— Несумненна, у нашай краіне павінны ўсе размаўляць па-беларуску — так было б правільна, і так раней было. Напэўна, сучаснасць, рэчаіснасць і мітусня нас трошкі аддаляюць ад нашай гісторыі і ад беларускай мовы. І, мабыць, кожны беларус шкадуе, што мы губляем хараство нашай мовы: калі нехта прыгожа размаўляе на беларускай мове, то яго вельмі прыемна слухаць. Што тычыцца мяне, то часам бывае, прачынаешся раніцай — і некалькі слоў вымаўляеш на беларускай мове. І скажу шчыра, я вельмі б хацеў размаўляць па-беларуску, але ўжо, напэўна, не атрымаецца. Бо ёсць звычкі, ёсць пэўная сістэма ў жыцці, а пераламаць сябе будзе цяжка. Але я падумаю і прапаную такую ідэю сваёй жонцы. Калі яна скажа «давай паспрабуем», то, напэўна, нешта і атрымаецца!

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА СПАДЗЯЕЦЦА, ШТО «ЗАЛАТАЯ ШАЙБА» АДКРЫЕ МНОГІМ ЮНЫМ ІГРАКАМ ДАРОГУ Ў ВЯЛІКІ СПОРТ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам рэспубліканскіх спаборніцтваў па хакеі сярод дзяцей і падлеткаў «Залатая шайба».**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі гэта адзін з самых папулярных і прадстаўнічых дзіцяча-юнацкіх спартыўных турніраў. Многія знакамітыя хакеісты пачыналі свой трыумфальны шлях менавіта з такіх спаборніцтваў.

«Маладым ігракам трэба сёння стаць галоўнымі дзеючымі асобамі яркага свята. Спадзяюся, што для многіх з вас гэты турнір адкрые дарогу ў вялікі спорт, — гаворыцца ў прывітанні. — У напружанай спаборніцкай барацьбе праяўляюцца лепшыя якасці асобы — баявы характар, сіла волі, смеласць і калектывізм. Вы заўсёды павінны памятаць, што згуртаванасць каманды з'яўляецца залогам яе паспяховага выступлення».

Прэзідэнт пажадаў усім удачы, дастойных перамог, прыгожых і відовішчных спартыўных паядынкаў.

## ФІНАЛЬНЫ ТУРНІР «ЗАЛАТОЙ ШАЙБЫ» Ў МАЛОДШАЙ УЗРОСТАВАЙ ГРУПЕ СТАРТАВАЎ У МАЛАДЗЕЧНЕ

**Двума паядынкамі ў Лядовым палацы ў Маладзечне днямі стартаваў фінальны турнір у малодшай групе (сярод ігракоў 1999-2000 гадоў нараджэння) рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў па хакеі «Залатая шайба» на прызы Прэзідэнта Беларусі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.**

Каманда «Прынёманскі» з Гродзенскай вобласці ўступіла «Алімпіі», якая прадстаўляе горад Мінск, — 2:5, а каманда «Мухавец» з Брэсцкай вобласці нанесла разгромнае паражэнне «Юнацтву» з Мінскай вобласці — 10:1. У фінальным турніры выступяць таксама каманды «Прамень» з Віцебскай вобласці, «Вымпел» з Гомельскай вобласці, «Равеснік» з Магілёўскай вобласці. Пераможца і прызёры «Залатой шайбы» вызначацца заўтра, 15 сакавіка. Фінальны турнір «Залатой шайбы» ў старэйшай узроставай групе (1998-1999 гадоў нараджэння) пройдзе 20-23 сакавіка ў Гомелі.

# РАБІЦЬ ДАБРО І АТРЫМЛІВАЦЬ ЗА ГЭТА ЛЬГОТЫ ХОЧА БЕЛАРУСКІ БІЗНЭС

**Пра сацыяльную адказнасць бізнэсу перад грамадствам сёння гавораць на ўсіх узроўнях. Кампаніі і прадпрыемствы, аб'яднанні і фонды інфармуюць грамадскасць аб тым, якую дабрачынную або спонсарскую дапамогу яны аказваюць дзіцячым дамам, установам адукацыі і культуры, людзям, якім патрэбна медыцынская дапамога. Яны шчыра лічаць, што гэта і ёсць сапраўдная сацыяльная адказнасць перад грамадствам, не ведаючы, што акрамя дабрачыннасці і спонсарства, маюцца і іншыя формы дапамогі, фінансава менш затратныя, але яны таксама прыносяць рэальную карысць канкрэтным асобам, групам і грамадству ў цэлым; напрыклад, валанцёрства, дабрачынны маркетынг і г.д.**

Пра гэта ішла размова на ток-шоу «Праект 1%: Права на сацыяльную адказнасць», арганізаваным фондам «Ідэя». Удзел у ім прынялі прадстаўнікі бізнэс-кампаній, грамадскіх арганізацый, дзяржструктур, а таксама СМІ. У ходзе рознабаковай дыскусіі быў не толькі абазначаны шэраг ключавых праблем у сферы «сацыяльнага» заканадаўства, але і прапанаваны магчымыя шляхі іх рашэння.

**Віктар Радзькоў, дырэктар па карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці фонду «Ідэя»:**

— Галоўная мэта любога прадпрыемства — прыносіць прыбытак. Аднак кампаніі, якія ідуць далей і вырашаюць аказваць дапамогу грамадству ў той ці іншай форме, сутыкаюцца з праблемай — аказаць яны яе сёння ў Беларусі могуць толькі з чыстага прыбытку, а значыць, толькі ў пэўны перыяд, пасля выплаты ўсіх падаткаў. А што рабіць, калі дапамога патрэбна аператыўна? Мы хочам рабіць агульную добрую справу і хочам, каб рабіць яе было проста: без лішніх нарматыўных актаў, без складанай справаздачнасці. Мы хочам спрасціць сітуацыю.

**Таісія Ялецкіх, галоўны дарадца ініцыятывы ААН «Глабальны дагавор»:**

— Дзяржаве важна матываваць і стымуляваць бізнэс, уносіць больш ўклад ва ўстойлівае развіццё грамадства. Так, няправільна будзе абкладаць бізнэс, які вырашае пэўныя сацыяльныя задачы, дадатковымі падаткамі. Таксама сёння дзяржава пазначае напрамкі аказання спонсарскай дапамогі. Гэта значыць не я вызначаю, на якія грамадска карысныя мэты я хацела б аддаць грошы, а гэта дыктуе мне дзяржава. У сусветнай практыцы фармулёўка іншая: любыя расходаванні на грамадска карысныя мэты льгатуюцца па пэўнай сістэме. Да таго ж, наша дзяржава дае падатковыя льготы, толькі калі ты займаешся дабрачыннай дзейнасцю ў дачыненні да дзяржустаноў. А калі я хачу рэалізаваць дабрачынны праект з некамерцыйнай арганізацыяй? У рамках існуючай заканадаўчай базы я магу гэта рабіць толькі з чыстага прыбытку.

Шмат складанасцяў і з дзяржпрадпрыемствамі. Аказанне любой дапамогі трэба ўзгадняць са сваімі міністэрствамі, і гэтым ніхто не хоча займацца. Пасля трэба яшчэ даць справаздачу, падрыхтаваць шмат дакументаў і адказаць на магчымыя пытанні з боку падатковай інспекцыі. Усё гэта вельмі перашкаджае развіццю карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці.

**Вольга Смалянка, юрыст, дырэктар Цэнтра прававой трансфармацыі:**

— Я павінна, перш за ўсё, сказаць, што заканадаўства — гэта не панацэя. Важныя — практыка і жаданне. Заканадаўства ж накіравана на стымуляванне працэсу. Ва ўсіх краінах Еўропы гэтае пытанне вырашана. Вырашаецца яно і на постсавецкай прасторы. У Беларусі на сёння існуе велізарны пералік нарматыўных актаў, якія так ці інакш рэгулююць пытанні сацыяльнай адказнасці. У нас цяпер адбываюцца кропкавыя станоўчыя змены ў заканадаўстве. Аднак для таго, каб стымуляваць развіццё карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці, трэба мець сістэмнае бачанне, канцэпцыю ўдасканалення заканадаўства. У нас да гэтага часу не існуе заканадаўчага азначэння, што ж такое «дабрачынная дзейнасць», «дабрачынныя арганізацыі» і інш. Аднак закон не будзе працаваць, калі мы гэтыя азначэнні проста сфармулюем — неабходны змены ў Падатковым Кодэксе РБ, у некаторых падзаконных актах.

**Міхаіл Собаль, дырэктар Міжнароднай грамадскай дабрачыннай арганізацыі «Надзея-Экспрэс»:**

— Што тычыцца грамадскіх арганізацый, я хацеў бы адзначыць, што ў многіх з іх няма належнай адкрытасці і празрыстасці, якая дазваляла б фарміраваць давер з боку бізнэсу, грамадства і дзяржаўных структур да нашай дзейнасці. Магчыма, наш сектар мае патрэбу ў распрацоўцы нейкага «Этычнага кодэкса», які б задаваў формы і правілы паводзін грамадскіх арганізацый.

**Наталля Злотніцкая, галоўны спецыяліст па фандрайзінгу сакратарыята Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа:**

— У сферы карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці ёсць разавыя акцыі, а ёсць устойлівыя партнёрскія адносіны. І ў гэтым выпадку няправільна будзе спаганяць падатак з арганізацыі, якая адлічвае грошы на дабрачыннасць. У шэрагу еўрапейскіх краін рашэнне знойдзена — 1% ад свайго даходу, які не абкладаецца падаткам, кожная бізнэс-структура вылучае на дабрачыннасць. І існуе зацверджаны рэестр надзейных і правераных грамадскіх арганізацый, з якіх бізнэс выбірае адрасата сваёй дапамогі.

**Наталля Маханько, дырэктар Міжнароднага дабрачыннага фонду дапамогі дзецям «Шанц»:**

— У 2010 годзе я была ўключана ў працоўную групу па распрацоўцы заканадаўчага акта ў галіне дабрачыннасці. Адной з нашых прапаноў стала ўнясенне змяненняў у Падатковы кодэкс РБ і павелічэнне льгот пры падаткаабкладанні на прыбытак да 10% пры аказанні дапамогі дзяржаўным арганізацыям. Згодна з падатковым заканадаўствам, яшчэ ў мінулым годзе льготы былі не больш за 5%. У студзені 2012 года былі ўнесены змяненні і дапаўненні ў Падатковы кодэкс Беларусі і прыняты льготы да 10%. Аднак і тут засталося абмежаванне — льготы дзейнічаюць у выпадку, калі гэтая дапамога перададзена бюджэтным арганізацыям, рэлігійным арганізацыям і тром грамадскім аб'яднанням — Беларускаму таварыству інвалідаў, Беларускаму таварыству глухіх і Беларускаму таварыству інвалідаў па зроку. Увесь астатні грамадскі сектар і бізнэс ільгот пакуль не маюць.

**P.S.** *Заканадаўчае рэгуляванне ў сферы карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці Беларусі мае патрэбу ў сістэмным падыходзе — да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі ток-шоу. Рэкамендацыі, сфармуляваныя па выніках форуму, будуць перададзены рабочай групе ў рамках Нацыянальнай платформы бізнэсу-2012, у якой распрацоўка законапраекта ў сферы сацыяльнай адказнасці з'яўляецца адным з ключавых пытанняў.*

**Святлана БУСЬКО.**

### КАМЕНТАРЫЙ

**Зінаіда Мандроўская, намеснік старшыні пастаяннай Камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў:**

— Сацыяльныя праекты сёння вельмі запатрабаваныя. І хачу адзначыць, што эканоміка Беларусі ўжо цяпер з'яўляецца больш сацыяльна арыентаванай, чым у суседніх краінах. У рэспубліцы створана заканадаўства, якое сур'ёзна падтрымлівае і стымулюе развіццё прадпрыемстваў, якія прадастаўляюць працоўныя месцы людзям з інваліднасцю. Прадстаўнікі бізнэсу наракаюць на высокія падаткі, якія стрымліваюць яго сацыяльную актыўнасць. Але варта адзначыць, што сёлета гэты аспект быў улічаны дзяржавай, паколькі падатак на прыбытак знізіўся з 24% да 18%. Акрамя таго, прыватныя кампаніі атрымалі дадатковыя стымулы для развіцця ў сувязі з фарміраваннем адзінай мытнай прасторы. Ільгатуецца прыбытак кампаній пры падтрымцы рэлігійных і бюджэтных арганізацый.

Існуе вялікая колькасць заканадаўчых дакументаў, якія рэгулююць сацыяльную актыўнасць — гэта і Грамадзянскі кодэкс РБ, і Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 300 «Аб прадастаўленні і выкарыстанні бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі», і Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 лістапада 2003 года № 24 «Аб атрыманні і выкарыстанні замежнай бязвыплатнай дапамогі» і інш. Аднак магу пагадзіцца з тым, што гэтым дакументам не хапае сістэмнасці. І праца па спрашчэнні павінна быць праведзена. Больш за тое — яна ўжо вядзецца. Вырашаецца пытанне з падаходным падаткам, які спаганяецца з ахвяраванняў прыватным асобам, ставіцца пытанне аб прадастаўленні крэдытаў на льготных умовах кампаніям, якія займаюць сацыяльна адказную пазіцыю і рэалізуюць грамадска значныя праграмы. Але, на мой погляд, сур'ёзнай асновай для хуткага пастулальнага рэфармавання заканадаўства ў бок лібералізацыі ў гэтай галіне з'яўляецца празрыстасць дзейнасці грамадскіх арганізацый.

# Удзень — навучанне ў ВНУ, а ўвечары — засваенне рабочай прафесіі

## Прыём у прафесійна-тэхнічныя ўстановы прапануюць зрабіць круглагадовым



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ні для каго не з'яўляецца сакрэтам, што ў рэйтынгу прафесій, якім аддае перавагу сучасная моладзь, рабочыя прафесіі або ўвогуле не фігуруюць, або займаюць апошнія пазіцыі. У сталіцы, напрыклад, больш як 70% выпускнікоў школ паступаюць у ВНУ і папаўняюць шэрагі мала запатрабаваных юрыстаў, эканамістаў і бухгалтараў. Пры гэтым найбольш шанцаў працаўладкавацца маюць на сёння прадстаўнікі менавіта рабочых прафесій... І пытанне, дзе ўзяць рабочыя рукі, становіцца для беларускай эканомікі ўсё больш актуальным. Летась паказчыкі прыёму не змаглі выканаць прафтэхустановы сталіцы, Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей. У гэтым годзе выпуск з базавай школы зменшыцца яшчэ на 6,5 тысячы чалавек і на 11,3 тысячы чалавек зменшыцца выпуск з сярэдняй школы. Таму можна меркаваць, што праблемы з укамплектаваннем прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў будуць і сёлета.

> **«Выкарыстоўваючы вячэрнюю форму, мы можам узяць на сябе часткова і навучанне студэнтаў ВНУ рабочым прафесіям, якія спатрэбяцца ім для работы ў пазаўрочны час, у тым ліку і ў будаўнічых атрадах»**

На думку **начальніка прафесійна-тэхнічнай адукацыі Міністэрства адукацыі Эдуарда ГАНЧАРА,** часта маладыя людзі не ідуць ва ўстановы прафтэхадукацыі не толькі таму, што «імідж некаторых з іх — не лепшы, але яшчэ і таму, што не лепшы і імідж некаторых прадпрыемстваў».

— Лічу, што прафтэхустановам і заказчыкам кадраў трэба разам ушчыльную працаваць з моладдзю, пачынаючы з правядзення прафарыентацыйнай работы, — заявіў, звяртаючыся да прадстаўнікоў абласцей падчас анлайн-калегіі ў Міністэрстве адукацыі, Эдуард Ганчар. — А што тычыцца сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, то даўно вядома, што калі яго кіраўнік ці спецыялісты прадпрыемства самі не падбяруць сабе ўчарашніх школьнікаў для навучання, не прапануюць ім прыстойныя ўмовы для працы і жыцця, то ніякага эфекту не будзе. У гэтай сферы тым больш патрабуецца індывідуальны падыход. Я бы папрасіў усіх звярнуць увагу на сайты ўстаноў адукацыі, асабліва на тую частку, дзе ўтрымліваецца інфармацыя аб прыёме. Як правіла, гэта фармальная інфармацыя, якая не выклікае асаблівай цікавасці ў моладзі. А па праграмах адукацыі для дарослых (і ўвогуле на сайтах) няма практычна ніякай інфармацыі. Нядаўна наш міністр паспрабаваў знайсці месца для навучання ўмоўнага знаёмага: прагледзеў усе сайты ўстаноў прафтэхадукацыі Мінска, але нічога не змог там знайсці. Хоць у недзяржаўных вучэбных цэнтрах падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ёсць вельмі прыцягальныя прапановы.

> **«Нядаўна міністр адукацыі паспрабаваў знайсці месца для навучання ўмоўнага знаёмага: прагледзеў усе сайты ўстаноў прафтэхадукацыі Мінска, але нічога не змог там знайсці».**

Эдуард Ганчар лічыць перападрыхтоўку рабочых па праграмах дадатковай адукацыі адным з важнейшых напрамкаў у забеспячэнні заказу кваліфікаваных рабочых:

— Займацца перападрыхтоўкай дарослых павінна кожная навучальная ўстанова, прычым праграмы для іх могуць быць рэалізаваны і па вячэрняй форме навучання. Яе трэба больш актыўна развіваць. Выкарыстоўваючы вячэрнюю форму, мы можам узяць на сябе часткова і навучанне студэнтаў ВНУ рабочым прафесіям, якія спатрэбяцца ім для работы ў пазаўрочны час, у тым ліку і ў будаўнічых атрадах. А чаму б усім рэгіёнам не выкарыстоўваць прыём па праграмах прафтэхадукацыі круглы год? Прычым не толькі ў завочнай, але і ў дзённай і вячэрняй формах атрымання адукацыі? Тым больш што кожны год шэрагі беспрацоўных папаўняюць каля 600 выпускнікоў агульнаадукацыйных школ, ад 12 да 14 тысяч чалавек мабілізуюцца з Узброеных Сіл, і частка з іх не мае прафесійнай падрыхтоўкі. А з ВНУ адлічваецца вялікая колькасць студэнтаў... Не ўсе яшчэ разумеюць неабходнасць скарачэння тэрмінаў навучання па праграмах прафтэхадукацыі. Аднак ёсць даручэнне кіраўніка дзяржавы і Міністэрства адукацыі. Ёсць рэкамендацыя, як гэта можна зрабіць без урону для якасці падрыхтоўкі. Скарачэнне тэрмінаў навучання паскорыць абарот у падрыхтоўцы рабочых кадраў і дазволіць нам дадаткова прыцягнуць выпускнікоў школ папярэдніх гадоў, якіх нярэдка проста адпужваюць вялікія і не заўсёды абгрунтаваныя тэрміны навучання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі **Казлову Аляксею Максімавічу** ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю **МАЦІ**.

■ Жыллёвая палітыка

## ПАМЕР КРЭДЫТУ Ў СІСТЭМЕ БУДЗБЕРАЖЭННЯЎ МАГЧЫМА ПАВЯЛІЧЫЦЬ

***Летась у студзені наша сям'я стала ўдзельнікам сістэмы будзберажэнняў. Тады мы з сынам адкрылі ў Клімавічах у Беларусбанку жыллёва-накапляльны рахунак на суму 40 мільёнаў рублёў. Быў заключаны дагавор з банкам, згодна з якім праз 19 месяцаў мы маглі тады атрымаць крэдыт памерам 160 мільёнаў рублёў. Потым адбылася дэвальвацыя, і цяпер за гэтыя 160 млн рублёў нейкага жылля ў сталіцы ўжо не купіш. Пад які працэнт нам ужо ў жніўні могуць даць крэдыт і ці магчыма нейкім чынам павялічыць суму крэдыту, бо цэны на жыллё істотна павялічыліся?***

**Пётр ЦЫГАНОК,**
*в. Галічы, Магілёўская вобласць.*

У аддзеле крэдытавання насельніцтва Беларусбанка, куды рэдакцыя звярнулася з гэтымі пытаннямі, нам адказалі наступнае. З моманту ажыццяўлення сістэмы будаўнічых зберажэнняў (2006 год) банк пастаянна аналізуе ступень задаволенасці ўдзельнікаў сістэмы гэтым фінансавым прадуктам і, зыходзячы са сваіх магчымасцяў, ідзе насустрач абгрунтаваным пажаданням.

Менавіта таму, у мэтах абароны інтарэсаў удзельнікаў сістэмы будаўнічых зберажэнняў, банкам 10 ліпеня 2011 года было прынята рашэнне, згодна з якім працэнтная стаўка па крэдыце ў сістэме будзберажэнняў роўная памеру сярэдневзважанай стаўкі рэфінансавання за перыяд тэрміну дзеяння дагавора жыллёвых зберажэнняў, павялічанай на адзін працэнтны пункт. У сувязі з гэтым спецыялісты Беларусбанка адзначаюць, што стаўка па крэдытах, якія прадастаўляюцца цяпер у межах сістэмы будзберажэнняў, значна меншая за памер, які вызначаўся папярэднімі ўмовамі пры ўступленні грамадзян у сістэму будаўнічых зберажэнняў.

Што тычыцца павелічэння памеру крэдыту, то пры павелічэнні індэкса цэн у будаўніцтве па заяве ўдзельніка сістэмы будзберажэнняў пералічваецца памер гэтага крэдыту з прымяненнем індэкса цэн у будаўніцтве.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

### АБЗАЦ

◢ **У Гродне падвялі выніку конкурсу на стварэнне помніка Максіму Багдановічу. За 4 месяцы мастакі і скульптары прапанавалі журы каля 20 ідэй. Конкурсная камісія абрала скульптурную кампазіцыю «Вянок» групы сталічных мастакоў на чале з Леанідам Гумілеўскім. Плануецца, што яе ўстановяць у цэнтральным парку імя Жылібера побач з фантанам, недалёка ад дома-музея Максіма Багдановіча. Класік беларускай літаратуры правёў у Гродне дзяцінства.**

◢ У Беларусі на новае месца жыхарства і працы ў студзені-лютым г.г. пры садзеянні службы занятасці перасяліліся 50 сем'яў беспрацоўных. Больш за ўсё такіх сем'яў, што змянілі прапіску, было ў Мінскай вобласці (20).

◢ **Пад коламі пасажырскага цягніка Брэст — Масква загінуў хлопец 1992 года нараджэння. Інцыдэнт адбыўся на станцыі Івацэвічы. Загінулы — мясцовы жыхар, ён працаваў зваршчыкам. Малады чалавек вяртаўся дадому з працы. Не пераканаўшыся ў адсутнасці цягніка, хлопец пайшоў цераз рэйкі па пешаходным насціле. На яго галаве быў капюшон, а сам ён слухаў музыку ў навушніках. Машыніст цягніка заўважыў пешахода за 150 метраў і пачаў сігналіць, аднак хлопец не рэагаваў. Давялося ўжыць экстранае тармажэнне, аднак пазбегнуць наезду не ўдалося.**

### ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ Каля 300 голых веласіпедыстаў праехалі 11 км па вуліцах сталіцы Перу Лімы. Удзельнікі акцыі такім чынам выказалі свой пратэст супраць непаважлівых адносін да іх кіроўцаў і ўраду краіны, які не падтрымлівае веласіпедны спорт. Акрамя гэтага, веласіпедысты заклікалі змяніць аўтамабілі на веласіпеды. Па-першае, гэта дабратворна адаб'ецца на экалогіі, а па-другое, знізіць лік загінулых у ДТЗ. Бунтары былі ў споднім або зусім раздзетыя. У незвычайным велапрабегу прынялі ўдзел як мужчыны, так і жанчыны. На целах многіх былі надпісы «Я люблю жыццё» і «Паважай мой веласіпед».

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# МІТРАПАЛІТ ІЛАРЫЁН ПЕРАСЦЯРОГ АД ПЕРАНОСУ Ў БЕЛАРУСЬ АСТАНКАЎ ІАСАФАТА КУНЦЭВІЧА

## Тэма правоў чалавека не можа вырашацца па-за кантэкстам паняцця адказнасці

**Размова пра гэта зайшла падчас прэс-канферэнцыі, якую старшыня Аддзела знешніх царкоўных сувязяў Маскоўскага Патрыярхата мітрапаліт Валакаламскі ІЛАРЫЁН даў напрыканцы свайго візіту ў Беларусь.**

**Каментуючы па просьбе журналістаў сучасныя ўзаемаадносіны праваслаўных і каталікоў на тэрыторыі Беларусі, мітрапаліт Іларыён сказаў:**

— Мне здаецца, сама гісторыя Беларусі паказала, што гэтыя дзве канфесіі могуць мірна суіснаваць, але вельмі важна пазбягаць якіх бы ні было сутыкненняў. Павінен сказаць, што мы з трывогай пачулі пра планы некаторых рэлігійных структур перанесці ў Беларусь астанкі Іасафата Кунцэвіча — асобы вельмі супярэчлівай. Я адкрыта казаў і ў размове з дзяржаўным сакратаром Ватыкана кардыналам Бертанэ, і са старшынёй Папскай рады па садзейнічанні хрысціянскаму адзінству кардыналам Кохам, што такога роду акцыя ніяк не будзе спрыяць кансалідацыі беларускага насельніцтва і не выкліча сімпатый да каталіцкай царквы. Наадварот, яна можа выклікаць у памяці старыя раны, нанесеныя ў тую эпоху, калі праваслаўныя і каталікі знаходзіліся на гэтых землях у стане варожасці. Я заклікаў кіраўніцтва Каталіцкай царквы ўстрымацца ад гэтай акцыі.

**Тэму адзінства хрысціян мітрапаліт Іларыён закрануў і пры адказе на пытанне пра магчымасць сустрэчы (у тым ліку на тэрыторыі Беларусі) Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі з Папам Рымскім:**

— Мы заўсёды, адказваючы на гэта пытанне, кажам, што такая сустрэча магчымая, але магчымая яна пры пэўных умовах. А менавіта — калі мы будзем разумець, што яна дапаможа вырашыць тыя праблемы, якія існуюць ва ўзаемаадносінах паміж Каталіцкай і Праваслаўнай цэрквамі. Мы не можам разлічваць на тое, што гэтыя праблемы будуць вырашаны падчас самой сустрэчы. Мы павінны быць упэўнены ў тым, што загадзя падрыхтавана платформа для таго, каб яны былі вырашаны. Праблемы звязаны, у першую чаргу, з суіснаваннем праваслаўных і грэка-каталікоў на Заходняй Украіне, дзе, як мы лічым, канфлікт дагэтуль не ўрэгуляваны. Мы неаднаразова казалі, што чакаем ад кіраўніцтва Рымска-каталіцкай царквы пэўных крокаў у гэтым кірунку. Пакуль што такія крокі не зроблены. Таму мы лічым сустрэчу магчымай, мяркуем, што рана ці позна яна адбудзецца. Але цяпер мы не гатовы казаць ні пра месца, ні пра час. Галоўнае для нас — граматна і добра яе падрыхтаваць.

**Разам з тым, кіраўнік Аддзела знешніх царкоўных сувязяў Маскоўскага Патрыярхата высока ацаніў стан спраў у Беларускай Праваслаўнай Царкве:**

— Думаю, што Беларуская Праваслаўная Царква ніколі не дасягала такога росквіту, як цяпер. Лічу, у гэтым вельмі вялікая асабістая заслуга яе кіраўніка — Мітрапаліта Філарэта, які ўжо 34 гады ўзначальвае Беларускі Экзархат. У гэтым вялікая заслуга епіскапата, духавенства і актыўных прыхаджан, якія працуюць для ўзнаўлення Царквы і для адраджэння духоўнасці і маральнасці ў грамадстве. Я думаю, што ў гэтым таксама заслуга беларускай дзяржавы, таму што тыя партнёрскія адносіны паміж Царквой і дзяржавай, якія сёння існуюць у Беларусі, вядома ж, спрыяюць і адраджэнню царкоўнага жыцця, і адраджэнню грамадства.

**Мітрапаліт Іларыён выказаў таксама свой погляд на праблематыку Царквы ў сучасную эпоху:**

— Сёння, з аднаго боку, час вельмі адчувальнага і відавочнага царкоўнага адраджэння, а з другога — час новых выклікаў. Мы ў савецкі перыяд жылі за «жалезнай заслонай», развіваліся ва ўмовах інкубатара. І былі шматлікія вельмі сур'ёзныя праблемы, але не было тых праблем, якія да нас прыйшлі пасля таго, як «жалезная заслона» ўпала. У прыватнасці, тая ідэалогія спажывецкага грамадства, якая пануе сёння ў заходніх краінах, не была характэрна для нашых краін, і гэта нешта новае, што асабліва моцна ўплывае на маладое пакаленне.

**Сучаснасці датычылася і пытанне пра стаўленне Царквы да актывізацыі руху ў абарону правоў сэксуальных меншасцяў, якая назіраецца ў Заходняй і Усходняй Еўропе:**

— Лічу, што тэма правоў чалавека не можа вырашацца па-за кантэкстам паняцця адказнасці. Чалавек мае не толькі правы, але і абавязкі: перад сабой, перад грамадствам, перад Богам.

Характэрнай асаблівасцю дэмакратычных рэжымаў з'яўляецца тое, што яны ўяўляюць платформу для рознага роду меншасцяў, што само па сабе, здавалася б, добра. Але праблема ўзнікае тады, калі воля меншасці сутыкаецца з воляй большасці, і калі, каб дагадзіць меншасцям, пачынаюць ігнараваць волю большасці. А самае галоўнае, што згаданыя меншасці будуюць сваю ідэалогію на такіх пазіцыях, якія непрымальныя з пункту гледжання рэлігійнага чалавека. І тут ужо іх светапогляд сутыкаецца з тым, што з'яўляецца для большасці людзей не проста важным, але святым. У гэтым сэнсе мы кажам, што прадстаўнікі гэтых меншасцяў замахваюцца на тое, што павінна заставацца непарушным — на абсалютныя маральныя каштоўнасці, якія мы атаясамляем з Божымі запаветамі.

Таму, вядома, вельмі важна, каб і ў дзяржаўным будаўніцтве, і ў грамадскіх дыскусіях найперш улічвалася меркаванне большасці людзей, а таксама нацыянальныя традыцыі кожнай дзяржавы. Калі на змену традыцыйнаму жыццёваму ўкладу прыходзяць тыя парадыгмы, якія заснаваны на нейкіх ідэалагічных тэорыях, што не ўлічваюць самасвядомасць большасці людзей, гэта становіцца крыніцай канфліктаў і можа прыводзіць да рознага роду правакацый. І гэта не толькі не кансалідуе грамадства, а наадварот, палярызуе яго.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ЗАГІНУЛІ Ў ГРУЗАВІКУ



Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, грузавік «Мерседэс-Бенц» стаяў у так званай прамысловай зоне Ксты (г. Полацк). Калі работнікі міліцыі адкрылі дзверы кабіны, то ўбачылі целы двух мужчын са слядамі тэрмічнага ўздзеяння. У кабіне былі ў наяўнасці ўсе прыкметы вынікаў пажару. Як высветлілася, загінулыя — жыхары Мінска, 1956 года нараджэння. Паводле слоў работнікаў прамзоны, на пагрузку яшчэ 7 сакавіка прыехалі дзве машыны. Адну загрузілі, а другая засталася на тэрыторыі. Паводле слоў сведак, кіроўцы 8 сакавіка знаходзіліся ў стане моцнага ап'янення, таму адмовіліся пайсці ў гасцініцу. Праз тры дні работнікі звярнулі ўвагу, што ніхто не выходзіць з машыны. Вядома, што грузавік зарэгістраваны ў Мінску і належыць індывідуальнаму прадпрымальніку. Разглядаюцца дзве версіі — неасцярожнасць пры курэнні і няспраўнасць аўтаномнага ацяпляльнага прыбора.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ВЁСКУ ПАКІНУЛІ БЕЗ АГАРОДЖЫ

149 секцый металічнай агароджы выкрадзены ў вёсцы Астражанка Лельчыцкага раёна. Старшыня пасялковага Савета тройчы звяртаўся ў міліцыю, бо зламыснікі выкрадалі вясковы плот часткамі — з канца лютага па пачатак сакавіка. Нарэшце было высветлена, што злачынства здзейснілі 19-гадовы непрацуючы з Мазырскага раёна і 14-гадовы школьнік з Мазыра. Кошт выкрадзенага складае амаль Br6,5 млн.

## ПА ДАРМАВУЮ ЦЯЛЯЦІНУ

З Мінскай вобласці ў Жыткавіцкі раён прыехалі «паляўнічыя» на цялят. Глыбокай ноччу зладзеі вывелі з незамкнутага памяшкання КСУП «Людзяневічы» ажно 10 жывёл. Страты гаспадаркі склалі амаль Br21 млн. Двух 20-гадовых злачынцаў затрымалі супрацоўнікі Маладзечанскага РАУС — за аналагічныя злачынствы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ЖОДЗІНЕЦ АТРЫМАЎ ТЭРМІН ЗА РАСПАЎСЮДЖВАННЕ ПОРНА

20-гадовага жыхара Жодзіна прызналі вінаватым у распаўсюджванні парнаграфіі з выявай непаўналетніх. Хлопец на сваім камп'ютары, падключаным да лакальнай сеткі аднаго з таварыстваў з абмежаванай адказнасцю, захоўваў відэафільмы парнаграфічнага зместу, у тым ліку і з выявай непаўналетніх і малалетніх. Устаноўлена, што летась са жніўня па кастрычнік ён адкрыў да гэтых фільмаў агульны доступ. У выніку забароненыя фільмы карыстальнікі сеткі скапіравалі не менш як 108 разоў.

— За ўказаныя злачынствы жодзінцу прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на 3 гады і 3 месяцы, — паведаміла старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна КАЛІНІНА. — Але суд улічыў тое, што абвінавачваны да гэтага не быў судзімы, цалкам прызнаў сваю віну, раскаяўся, і прымяніў у адносінах яго адтэрміноўку выканання прысуду тэрмінам на 2 гады. Прысуд не быў абскарджаны і ўступіў у законную сілу.

Сёлета ў лютым у суд горада Жодзіна пракуратурай вобласці накіраваны яшчэ дзве аналагічныя справы ў адносінах мясцовых жыхароў.

**Надзея ДРЫЛА.**

■ Соцыум

# ПЯТРОВІЧ НА ЧАЙЦЫ

**ГЭТА ў горадзе можа быць па-веснавому цёпла і сыра, а на беларуска-расійскім памежжы, у Мсціслаўскім раёне, яшчэ ляжаць снягі. Праз сумёты на прасёлачных дарогах сацыяльны работнік Сяргей ЛЯВОНАЎ прабіраецца на санях, у якія запрэжаны конь па мянушцы Чайка.**

Аддаленыя вёскі нярэдка дораць незвычайнае для гараджаніна адчуванне іншага вымярэння. Нібыта машына часу пераносіць цябе ў іншы свет — з патрыярхальным бытам, прастадушнымі людзьмі і амаль ідылічнымі пейзажамі навокал. Вось і тут, у Валоўніках, з неба падае пушыстымі камякамі снег, праз аблокі прабіваецца нияркае сонейка, ціха рыпяць і мякка едуць сані, духмянае сена і коўдра абараняюць ад холаду, а Сяргей Пятровіч пад фырканне Чайкі расказвае пра сваё жыццё і працу:

— Мая дапамога патрэбна адзінокім старым людзям. Два разы на тыдзень я набываю ў аўтакраме і прывожу ім неабходныя прадукты, таксама прыношу брыкет і дровы, ваду. Раблю ўсё, што трэба па гаспадарцы.

Сяргею Пятровічу 47 гадоў, ён родам з Мсціслаўшчыны, але давялося папрацаваць і на заводзе ў Магілёве, і на чыгунцы ў Крычаве, і ў мясцовай сельскай гаспадарцы. Потым стаў сацыяльным работнікам і «прыжыўся» на гэтай працы.

Мы заязджаем у Сасноўку — адзін з хутароў, якія і ўтвараюць вёску Валоўнікі. На вясковай вуліцы толькі некалькі жылых дамоў (шмат дачных і ўвогуле закінутых). У дзвюх хатах жывуць адзінокія пенсіянеркі, яшчэ ў адной — муж з жонкай, інваліды. Усім ім дапамагае Лявонаў.

Сяргей Пятровіч акуратна «паркуецца» каля хаты Валянціны Дзмітрыеўны Някеевай і расказвае пра каня. Чайка — гэта «ключавы элемент» працы сацыяльнага работніка ў Валоўніках.

— Самі бачыце, якія навокал гурбы, хоць дарогі спраўна чысцяць. Сёння пачысцілі — а назаўтра заваліла! За дзень даводзіцца праехаць некалькі дзясяткаў кіламетраў, ды па пагорках і палях! Для пешага шпацыру надта вялікія адлегласці, а ў санях (ці на колах, як улетку) значна прасцей, ды і месца ёсць для усіх заказаў. Транспарт у мяне свой, дзякуй Богу. Чайка — вельмі спакойная і надзейная жывёліна.

Чайка меланхалічна жуе сена, не звяртаючы ўвагу на сабаку, які гучна сустракае гасцей...

Сяргей Пятровіч выкладае прадукты перад гаспадыняй у адпаведнасці са спісам і чэкам: хлеб, каўбаса вараная з салам вышэйшага гатунку, садавіна, слоік працёртых з цукрам чарніц.

— О! Падмацаванне бабулі! Каб не хварэць, патрэбны вітаміны, — радуецца Валянціна Дзмітрыеўна.

Жанчына называе свайго памочніка Сярожачкам і мае на гэта права. Яна — былая настаўніца і вучыла Лявонава ў школе. Цяпер кажа, што ён добры хлопец, кемлівы і энергічны памочнік, на якога заўсёды можна разлічваць. Мужа Някеевай ужо няма, а сыны жывуць з сем'ямі ў гарадах.

— Зразумела, мне тут, на краі свету, адзінока, але я пакуль да нявестак не збіраюся. Яны вельмі добрыя, грэх дрэннае слова сказаць, але не хачу маладым перашкаджаць. Сыны прыязджаюць часта, а два разы на тыдзень дапамагае Сярожа. Ён вясковы хлопец, усё па гаспадарцы ведае і спрытна робіць.

Пакуль Сяргей Пятровіч прабівае лапатай сцежку да хлява,


Сяргей ЛЯВОНАЎ і яго Чайка.

**ДАВЕДКА:**
**У Магілёўскай вобласці сацыяльнымі службамі абслугоўваюцца на даму 11,1 тысячы непрацаздольных жыхароў. Увогуле ў рэгіёне жыве амаль 15 тысяч адзінокіх пенсіянераў. Усім непрацаздольным па неабходнасці сацыяльныя службы гатовы падставіць сваё плячо, абяцаюць у Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама.**

каб прынесці ў хату брыкет, ды едзе з вялікімі бітонамі па ваду да калодзежа, Валянціна Дзмітрыеўна размаўляе з гасцямі, прадстаўнікамі сельскай і раённай улады.

— Хутка 80 гадоў, але я трымаюся. Дбаюць пра нас улады. Бачыце, як добра мне пляцоўку каля хаты пачысцілі? Хоць самалёт прымай...

Увесь стол Валянціны Дзмітрыеўны завалены таблеткамі, побач — папулярная лячэбная расліна залаты вус, на сцяне вісяць рамкі са старымі фотаздымкамі. Лепшы сябра — чорны кот Міцяй — вядомы ў акрузе прымусовай дыетай: ката выпадкова закрылі ў лазні, дзе не было вады і ежы, і спахапіліся толькі праз тыдзень (!). Выжыў, але моцна схуднеў, стаў нервовым і кожны раз пры набліжэнні людзей буркоча як магутны трактар...

— Я тут не гарую, — робіць выснову пенсіянерка. — Але добра, што ёсць сацыяльны работнік. Не толькі дапаможа, але і ўсе навіны раскажа: як хто жыве з далёкіх суседзяў. Сярожа — мая сувязь з «вялікай зямлёй».

Як расказала старшыня Мушынскага сельскага Савета Вольга Дадыкіна, Валоўнікі — сапраўды самы аддалены населены пункт на тэрыторыі. На невялікіх аб'яднаных хутарах тут жыве ўсяго 30 чалавек, і гэта ў асноўным старыя адзінокія людзі.

— Калі б не сацыяльныя работнікі, то ім складана прыйшлося б, — лічыць Вольга Яўгеньеўна. — Пажылым людзям патрэбен клопат. Таму сацыяльны работнік у нас ёсць у кожнай вёсцы.

На той жа вуліцы наведваем мужа і жонку Пуцілаў.

— Абслугоўваюць нас добра, — запэўнівае Валянціна Ільінічна, і яе муж Павел Аляксандравіч з ёй цалкам згодны. — Ён усё робіць, што ні папросім.

Пакуль ідзе гутарка — Сяргей Пятровіч прынёс дроў у хату. «Праца нармальная!» — гаворыць Сяргей Пятровіч. Да кожнага з пенсіянераў, зразумела, патрабуюцца свой падыход і цярпенне. Не ўсё бывае гладка, здараюцца (як і ўсюды) напружаныя сітуацыі. Але імкненне ўладжваць спрэчныя пытанні дапамагае захаваць добрыя адносіны.

— Старыя — нібыта малыя, — кажа Вольга Дадыкіна. — Але ніякіх скаргаў на сацыяльных работнікаў да нас не паступала.

На заробак сацыяльнага работніка, які абслугоўвае дзясятак чалавек, Сяргей Пятровіч не скардзіцца. Прыкладна паўтара мільёны — на «хлеб з маслам» вяскоўцу хапае. Маўляў, будзем разлічваць на тое, што ёсць, даглядаць сям'ю, гадаваць дзяцей. Сам ён таксама жыве на адным з хутароў Валоўнікаў.

— Я так думаю, што мая праца сапраўды патрэбная, — каментуе Лявонаў. — Цяжка сабе уявіць, што старыя людзі з хворымі нагамі пойдуць да аўтакрамы па прадукты. Можа, і дойдуць, але як потым вярнуцца з цяжкай сумкай? І калодзеж тут глыбокі — пакуль з яго ваду выцягнеш... Ды я не адзін такі — нас, сацыяльных работнікаў, шмат.

Адзіноцтва старых людзей у аддаленых і, як кажуць, бесперспектыўных вёсках — гэта актуальная праблема сельскага жыцця.

— Але гэтыя людзі не застаюцца без нашай увагі, — падкрэслівае старшыня Мушынскага сельскага Савета. — Мы літаральна нядаўна аб'ездзілі і абышлі ўсіх разам з прадстаўнікамі аддзела МНС і ўчастковымі. Бо цяпер халодная і рызыкоўная з пункту гледжання пажараў пара. Трымаем на кантролі гэтае пытанне, ды і ўвогуле ніколі не пакідаем па-за ўвагай адзінокіх старых.

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**
*Мсціслаўскі раён*


Валянціна Дзмітрыеўна НЯКЕЕВА.

## ПАМЯЦІ МАШЭРАВА

**На Віцебшчыне адбыўся лыжны паход у гонар гадавіны з дня нараджэння П.М. Машэрава.**

Каманда моладзі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава пабывала ў месцах, звязаных з жыццём выдатнага грамадскага дзеяча: у Сенненскім раёне, дзе Пётр Міронавіч нарадзіўся, Расонскім, дзе ён працаваў у школе перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Удзельнікі паходу ўсклалі вянкі да помнікаў і мемарыялаў, чысцілі снег на падворках ветэранаў, дапамагалі наводзіць парадак.

## ВЫРАТАВАЛЬНІКІ — ВЫДАТНЫЯ РЫБАКІ

**Выратавальнікі Віцебшчыны паказалі майстэрства... па падлёднай лоўлі рыбы падчас абласных спаборніцтваў.**

На лёд возера Лосвіда ў Віцебскім раёне выйшлі прадстаўнікі як абласнога ўпраўлення МНС, так і гарадскіх і раённых аддзелаў, а таксама грамадскага аб'яднання «Выратавальнік».

Па выніках турніру «залаты медаль» заваявала каманда Лёзненскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, «серабро» — у выратавальнікаў Шумілінскага раёна, а трэцяе месца — у пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада «Віцязь» з абласнога цэнтра. Асобна вызначылі пераможцаў у намінацыі «За самую вялікую злоўленую рыбу».

## У СІМФЕРОПАЛЬ НА ХАЛЯВУ

**43-гадовая жыхарка Оршы, правадніца, умудрылася па чужым службовым дакуменце бясплатна даехаць да Сімферопаля і назад.**

Для таго, каб атрымаць бясплатныя пасадачныя білеты ў цягнікі Віцебск — Сімферопаль і Сімферопаль — Полацк «прадпрымальная» дама прад'явіла спецыяльнае транспартнае пасведчанне, якое належыць іншай работніцы чыгункі. Апошняя працуе ў Аршанскім вагонным дэпо. У дачыненні да «зайкі» заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Квадратныя метры

# ПАСЛЯ НАС — ХОЦЬ ПАТОП?

**НА балансе нашых камунальных арганізацый знаходзяцца жылыя дамы, кватэры ў якіх, як правіла, прыватызаваныя, хоць ёсць яшчэ там і дзяржаўныя. Астатняе жыллё — а гэта, найперш, дамы жыллёвых кааператываў — людзі абслугоўваюць самастойна. Яны надзелены правамі, якія даюць магчымасць распараджацца сваёй і агульнай маёмасцю, падтрымліваць яе ў належным стане. Але такая свабода часта супярэчыць устаноўленым законам.**

Калі тэхнічнае абслугоўванне дома ажыццяўляе камунальная структура, то ўсё проста. ЖЭС выстаўляе рахунак, і гаспадар кватэры плаціць грошы. Жыльцу, магчыма, нешта і не падабаецца, але ён не можа нічога змяніць, бо існуе ўстаноўлены парадак і ніхто не аспрэчвае яго. А вось у жыллёвым кааператыве сітуацыя іншая. Што датычыцца аплаты за ваду, газ, электрычнасць, то тут аплачваюць без усякіх агаворак. Вялікая ўвага надаецца і сваім кватэрам. Каб прывесці іх да ладу, грошай гаспадары не шкадуюць. Драўляныя вокны мяняюць на пластыкавыя, а дзверы ў кватэрах спрэс новыя — на некалькі замкоў.

Але Радзіма ў нашага чалавека заканчваецца за парогам кватэры. Агульная нерухомая маёмасць дома (міжкватэрныя лесвічныя клеткі, ліфты, дах, падвал, каналізацыя, водаправод...) многіх жыльцоў ужо мала цікавіць, бо, каб падтрымліваць іх у парадку, неабходна штомесячна ўносіць грошы. Я сам жыву ў жыллёвым кааператыве і ведаю праблему знутры. Як толькі размова заходзіць пра грошы, адразу ўзнікаюць непаразуменні. Напрыклад, паўстала пытанне рамонту даху — тут жа ў адказ:» Хто жыве на апошнім паверсе, няхай і рамантуе!» Атрымліваецца, што ў 90-кватэрным доме дах патрэбны толькі пятаму паверху! Але ж існуюць законы, па якіх такія адлічэнні абавязаны быць агульнымі.

Вось і Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 43 ад 28.01.2008 года сцвярджае: «Арганізацыя забудоўшчыкаў абавязана забяспечваць: адлічэнні на капітальны рамонт дапаможных памяшканняў, канструктыўных элементаў, інжынерных сістэм дома пры яго эксплуатацыі ва ўстаноўленым парадку» (арт. 26)

Грошы павінны адлічвацца не толькі на капітальны рамонт, але і на бягучы. Здавалася б, усё зразумела, ды дзе там! Пытанне аб адлічэнні грошай выносіцца на агульны сход, і большасць галасуе... супраць! Такая сітуацыя складвалася і ў нашым кааператыве. У мінулыя гады (да фінансавага крызісу) грошы на капітальны рамонт не збіралі і будматэрыялы, якія былі ўтрая танней, не куплялі. А каб сабраць



сёння неабходную суму на рамонт таго ж даху, патрэбен час.

У жыллёвых кааператывах ёсць старшыня, бухгалтар, сантэхнік, электрык, дворнік..., якім трэба плаціць зарплату. І зноў жа, памер яе ўстанаўлівае сход жыльцоў. А якія баталіі адбываліся, каб дворніку павысіць зарплату (была 110 тысяч)! І колькі часу таго дворніка шукалі па ўсім горадзе! Давялося павысіць.

Грошы неабходна мець і на бягучы рамонт. Напрыклад, спілаваць дрэвы, якія некалі пасадзілі на цеплатрасе, вывезці восенню лісце... Няўжо ў кожным выпадку патрэбна галасаваць на сходзе? Дарэчы, са старшынёй жыллёвага кааператыва павінна працаваць і праўленне. Важна, каб там аказаліся адукаваныя людзі, якія могуць разабрацца ў сітуацыі і законах.

Паводле Закона «Аб сумесным домаўладанні» (8.01.1993 г. «135-3) мясцовая ўлада абавязана кантраляваць прававыя, сацыяльныя, арганізацыйныя і эканамічныя адносіны ў жыллёвых кааператывах. Толькі не заўсёды кантроль бывае эфектыўным. Вось у канфліктнай сітуацыі некалькі жыльцоў звяртаюцца ў пракуратуру горада і ўказваюць на парушэнне закона. Заява адтуль перасылаецца ў жыллёвы аддзел гарвыканкама і... на гэтым усё заканчваецца. На заяву прыходзіць фармальны адказ, і ўсё застаецца як раней.

Прадастаўленыя магчымасці самакіравання, здавалася б, павінны выхоўваць людзей, дапамагаць ім адчуваць сябе гаспадарамі. Але даволі часта самакіраванне ператвараецца ў анархію.

На мой погляд, ёсць пэўныя пралікі і ў законе. Напрыклад, жыльцы прыватызаваных кватэр (якія знаходзяцца на балансе ЖРЭУ) за тэхнічнае абслугоўванне жылых дамоў плацяць толькі 32,8 працэнта выдаткаў, а астатнюю частку — 67,2 працэнта — аплачвае дзяржава. А той, хто пражывае ў жыллёвым кааператыве, за тое ж абслугоўванне выкладвае са сваёй кішэні ўсе 100 працэнтаў на працягу года, і невядома калі атрымае кампенсацыю. У першым выпадку людзям дасталося дармавое жыллё і яны маюць яшчэ і льготы, а ў другім — пабудавалі кватэры за свой кошт і разлічваюць толькі на сябе.

Можа, было б больш справядліва ўсіх жыльцоў паставіць у аднолькавыя ўмовы? Няхай за тэхнічнае абслугоўванне дамоў плацяць рэальныя сумы.

Жыхарка г. Баранавічы Дар'я Курыла ўзначальвае тры жыллёвыя кааператывы:

— У двух нашых дамах пражываюць у асноўным пенсіянеры, з якімі складана знайсці кантакт, — кажа яна. — А вось у новым доме жывуць маладыя, і там няма вялікіх праблем. Ад іх не пачуеш фразу, што «на мой век гэтага хопіць». Безумоўна, сёння ў людзей розныя даходы, але, тым не менш, кожны жылец павінен адчуваць, што яму належыць не толькі кватэра, але і дом, у якім ён жыве. Калі чалавек не адчувае сябе гаспадаром, грамадзянінам, то цяжка рухацца наперад. Ёсць прэтэнзіі і да будаўнічых арганізацый, якія няякасна выконваюць работу, але галоўнае, неабходна ўдасканальваць Жыллёвы кодэкс. Чаму ў дамах, якія знаходзяцца на балансе камунальнай арганізацыі, плацяць за тэхнічнае абслугоўванне 1 квадратнага метра жыллёвага памяшкання толькі 350 рублёў, а ў жыллёвых кааператывах — цалкам? За карыстанне ліфтам устаноўлена плата ў памеры 1 тысячы рублёў, а нам у кааператыўных дамах фактычна прыходзіцца плаціць 3 тысячы рублёў. Быццам бы дзяржава і павінна кампенсаваць затраты, але пакуль што ёсць праблемы з вяртаннем грошай...

Аднак і без Жыллёвага кодэкса зразумела: калі чалавек жыве ва ўласным доме ён павінен трымаць яго ў парадку і не спадзявацца на суседа і дзяржаву.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ**

■ Непрыгожая справа

# ВЯРЦЕЛІ, ЯК ХАЦЕЛІ

## справаздачнасцю на Драгічынскім камбікормавым заводзе

**ЗДЗІЎЛЕННЕ, калі не сказаць больш, выклікаюць маштабы некаторых махінацый і «бясстрашнасць» іх, так бы мовіць, аўтараў. На што яны спадзяваліся, падтасоўваючы дакументы, хутчэй за ўсё, будуць тлумачыць у судзе... Але ўсё па парадку.**

Да Драгічынскага камбікормавага завода ў свой час далучылі прыгараднае сельгаспрадпрыемства, якое цяпер называецца сельскагаспадарчы вытворчы філіял «Прыазёрны». На фермах «Прыазёрнага» ўтрымліваюцца цяляты розных узроставых груп.

Але ў канцы мінулага года ў Камітэт Дзяржкантролю рэспублікі паступіў сігнал ад вяскоўцаў аб тым, што жывёлагадоўчая праца на фермах вядзецца нездавальняюча, маюць месца значныя падзяжы маладняку. Але апошнія факты кіраўнікі як філіяла, так і галаўнога прадпрыемства ўмела ўтойваюць ад справаздачнасці. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзела зваротаў грамадзян і арганізацыйнай работы абласнога КДК Віктар ВАСІЛЕЎСКІ, пісьмо было накіравана ў Брэст. Камітэт Дзяржкантролю Брэсцкай вобласці арганізаваў пазапланавую праверку гаспадарчай дзейнасці камбікормавага завода.

Высветлілася, што на фермах вышэйназванага філіяла «Прыазёрны» нідзе не паказаны факт падзяжу 256 цялят. Па дакументах выходзіла, што менавіта такую іх колькасць сельгаспрадпрыемства прадало сваім працаўнікам... жывой вагой. А калі праверылі маладняк на ферме вёскі Сірэнеўка, аказалася, што разыходжанні паміж сапраўднай вагой цялят і тым, што пазначана на паперы, складалі ў групе «бычкі на адкорме» — 2093, а ў групе «бычкі на дарошчванні» — 8375 кілаграмаў.

Акрамя таго, былі выяўлены іншыя парушэнні. Хоць справы на прадпрыемстве ішлі не лепшым чынам, яго кіраўнік сябе не крыўдзіў, сваіх спецыялістаў — таксама. Так, пры наяўнасці пратэрмінаванай запазычанасці па атрыманай бюджэтнай пазыцы ў памеры 23,4 мільёна рублёў, у сакавіку 2011 года дырэктару і галоўным спецыялістам завода былі выплачаны прэміі на суму больш за 24 мільёны рублёў.

Не дзіўна, што пасля праверкі была заведзена крымінальная справа ў дачыненні да галоўнага бухгалтара ААТ «Драгічынскі камбікормавы завод», а таксама пяць крымінальных спраў у дачыненні да загадчыкаў фермаў філіяла «Прыазёрны». Пазней, падчас дадатковых праверак, усплыла яшчэ адна непрыгожая справа вышэйназванага прадпрыемства. На гэты раз «засвяцілася» кіраўнік назіральнага савета ААТ. Менавіта яна прыняла рашэнне прадаць трохпакаёвую кватэру, якая знаходзілася на балансе завода і была ацэнена амаль у 110 мільёнаў рублёў, усяго за 40,9 мільёна... Каму? Дырэктару прадпрыемства. Цяпер і кіраўнік назіральнага савета знаходзіцца пад следствам. А дырэктар ААТ вызвалены ад пасады. Лагічнае завяршэнне гісторыя атрымае пасля таго, як Следчы камітэт перадасць матэрыялы ў суд і суд вынесе рашэнне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# Сямейныя справы Пузанкевічаў

**Сям'я Пузанкевічаў — прадстаўнікі рэдкай прафесіі ў нашай краіне. Справа ў тым, што муж і жонка, Генадзь і Таццяна, — адны з нямногіх у Беларусі, хто выраблае чучалы птушак і жывёл. Першым у сям'і захапляцца гэтай справай стаў Генадзь, пасля да яго далучыліся Таццяна і дзеці. Сёння Пузанкевічы — адны з самых вядомых таксідэрмістаў Беларусі.**



У гэтым доме заўсёды чуваць спеў жывых птушак. У клетках і вальерах жывуць дэкаратыўныя куры з розных краін свету. Папугай Арчы, адзіны зеленакрылы ара ў краіне, — сапраўдны сябар сям'і. А яшчэ тут займаюцца рэабілітацыяй драпежных птушак: Генадзь Канстанцінавіч даглядае двух беркутаў, якіх прывезлі ледзь жывых.

Генадзь Пузанкевіч больш чым за трыццаць гадоў вырабіў каля сямі тысяч чучал. Яго калекцыя (у асноўным птушкі) — больш за 250 асобнікаў — унікальная для Беларусі і па колькасці, і па разнастайнасці. Каго тут толькі няма! Мядзведзь, лось, кракадзіл, мноства розных птушак — усё гэта можна пабачыць у доме гаспадара, у сапраўдным музеі, які мае статус асабліва каштоўнай прыватнай заалагічнай калекцыі Рэспублікі Беларусь. Нездарма гаспадара гэтых работ запрашаюць не толькі прыватныя калекцыянеры, але і буйныя заапаркі і заалагічныя інстытуты свету. Напрыклад, у адноўленым Музеі прыроды, што ў Белавежскай пушчы, амаль 80% чучал птушак выраблены Генадзем Пузанкевічам, як, дарэчы, і ў музеі Прыпяцкага запаведніка, дзе гэтая лічба дасягае амаль 100%.

Генадзь дзеліцца, што чучала зрабіць можа кожны, а вось «ажывіць», надаць добрую позу — гэта вельмі складана. Дарэчы, робіць ён свае экспанаты з загінулых прадстаўнікоў фаўны, бо з'яўляецца праціўнікам любых паляванняў і мэтанакіраванага знішчэння жывых істот.



Генадзь Канстанцінавіч — дасведчаны фатограф. Бывае, суткамі праседжваў у зарасніках дзеля аднаго добрага здымка. Затое потым яго фатаграфіі станавіліся ілюстрацыямі да падручнікаў, а назіранні — каштоўнымі звесткамі для Чырвонай кнігі Беларусі. Да таго ж ён — вялікі аматар падарожнічаць. У вольны час Генадзь і Таццяна наведваюць розныя краіны і менавіта там, пашыраючы свае веды па біялогіі, набываюць рэдкіх птушак і расліны.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**
*г. Жодзіна.*



## КАТЫ НАС ПРЫРУЧЫЛІ

**ВЫСТАВА катоў, якая прайшла ў Бабруйску, карысталася вялікай папулярнасцю. Супрацоўнікі выставачнай залы мастацкага музея імя Паплаўскага, дзе праходзіла выстава, прызналіся, што даўно не бачылі такога наплыву наведнікаў. Людзі стаялі ў чарзе, каб паглядзець на ўсю гэту вусатую і паласатую прыгажосць.**



Арганізатарам выставы выступіў клуб аматараў катоў «Басцет». У Бабруйск прывезлі прыкладна сотню розных парод: «голых» сфінксаў, плюшавых «брытанцаў», вялікіх і падобных да рысяў мэйн-кунаў, пушыстых персаў і шмат іншых яшчэ мала вядомых шырокай публіцы парод. «Хто б мог уявіць, што адзін «футравы шарык» здольны прынесці столькі радасці!» — з гэтай вядомай ірландскай прымаўкай цалкам пагадзіліся жыхары Бабруйска.

**Ілона ІВАНОВА.**

■ Прамая лінія газеты «Звязда» і радыёстанцыі «Мір»

# ЦЯЖКІ «ЯБЛЫЧАК»

**Сумесна з радыёстанцыяй «Мір» наша газета правяла «прамую лінію» па тэме асаблівасцяў пераходнага ўзросту. На пытанні карэспандэнтаў, а таксама слухачоў і чытачоў адказаў псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага дзіцячага псіханеўралагічнага дыспансэра Віктар ГУБКІН.**

***(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 3 і 6 сакавіка.)***

***☎— Мінск, Надзея. Дачцэ 17 гадоў. Выхоўваю адна. Апошнія пяць гадоў стасункі нашы пагоршыліся. Дачка праяўляе грубасць, не цікавіцца маім жыццём і маімі праблемамі, што мяне вельмі крыўдзіць. А на людзях яна ветлівая і пяшчотная...***

— Гэта якраз прыклад таго, што ў дзяўчыны праблема не з соцыумам, а менавіта з маці. Незразумела, па-першае, чаму маці крыўдзіцца. Ад дзіцяці не трэба патрабаваць, каб яно замяняла мужа. Калі вы хочаце пагаварыць пра дарослыя праблемы, ідзіце да дарослай сяброўкі. Калі ж дзіця адмаўляецца дапамагаць, то, хутчэй за ўсё, вы з самага ранняга дзяцінства не прывучалі яго да такіх сямейных узаемаадносін. Чаго ж патрабаваць, калі дзіця вырасла?

Усё, што мы паспяваем даць дзіцяці да 7 гадоў, то і будзем атрымліваць на працягу, як мінімум, наступных дзесяці. Праўда, у дробязях мы заўсёды можам спрабаваць адпрацоўваць свае «памылкі»... Дапусцім, у пакоі дзіцяці непарадак. Часам ён нават патрэбны. Для таго, каб дзіцяці нешта спатрэбілася, і яно паспрабавала навесці парадак па закліку ўласнай душы, а не па жорсткім патрабаванні бацькоў. А часам бацькам не лішне прапанаваць сваю дапамогу, каб канкрэтна паказаць, як прыгожа можна зрабіць.

У выхаванні трэба спалучаць мяккасць характару і жорсткасць патрабаванняў. Калі мы прад'яўляем нейкае патрабаванне, яно павінна быць, па-першае, адно, па-другое, кароткае і адэкватнае. Калі мы кажам, што дзіця павінна прыходзіць дадому ў 22.00, то павінны патлумачыць, чаму так і не інакш. І тут не можа быць ніякіх ваганняў. Дарэчы, ідэальны варыянт — каб дзіця клалася спаць у 21.00. У супрацьлеглым выпадку мы бачым у школе сонныя вочы, рассеянасць, няздольнасць да вучобы ў прынцыпе.

Другі важны момант — самому таксама трэба трымацца пэўных правілаў. Калі дзіця бачыць, што вы гуляеце ў камп'ютарныя гульні да трох гадзін раніцы, а ад яго патрабуеце класціся спаць а 21-й гадзіне, то дакладна можна сказаць: будуць канфлікты.

Калі мы просім выключыць камп'ютар, то павінны патлумачыць, чаму гэта трэба зрабіць. Можа быць, давядзецца патлумачыць неаднойчы. Калі будзеце практыкаваць гэта з самага ранняга дзяцінства, то надалей спрацуе звычка. Адсутнасць жа дысцыпліны адаб'ецца і на дарослым жыцці. Вядома, ёсць дарослыя, якія не могуць прачнуцца, прымусіць сябе выконваць нейкія абавязкі.

Нарэшце, трэба прыгадаць і пра пачуццё гумару. Гумар у нашым жыцці адыгрывае вельмі важную ролю. Чым часцей у вашай сям'і ўсміхаюцца, тым больш у вас шчасця, даверу, расслаблення... Безумоўна, у некага можа быць дрэнны настрой, і тады ўсе могуць яму паспачуваць. Усё ж такі сям'я — гэта своеасаблівае згуртаванне, дзе ўсе разважаюць, у прынцыпе, аднолькава. Калі некаму дрэнна, сям'я аб'ядноўваецца, каб дапамагчы. Аднак іншая рэч, калі падлетак пастаянна бачыць толькі незадаволеныя, хмурыя, злыя твары...

***☎— Мінск, Арына. Малодшаму брату 14 гадоў. Размаўляць з ім і мне, і бацькам, мякка кажучы, няпроста. А самае важнае, ён не жадае вучыцца, наогул не імкнецца чытаць, усё спісвае з дапамогай мабільнага... Нам усё пусціць на самацёк або ёсць нейкія варыянты ўздзеяння?***

— Часам трэба не толькі гаварыць, але і нешта рабіць. Чаму дапускаецца спісванне з мабільнага? Чаму ў 14-гадовага падлетка мабільнік мае большыя функцыі, чым проста прыём званкоў?

***☎— Мінская вобласць, Ірына Аляксандраўна. Цікава, што вы думаеце наконт таго, якім чынам бацькі павінны ўдзельнічаць у школьным жыцці? Можа быць, вы дасце некалькі парад, як трэба паводзіць сябе бацькам школьнікаў з іх настаўнікамі, дырэктарам школы, каб гэта было на карысць і школе, і дзецям?***

— Бацькі павінны ўдзельнічаць у школьным жыцці роўна столькі, колькі гэта неабходна для ведання сапраўднага становішча з паспяховасцю. А не для таго, каб спрабаваць такім чынам падняць ацэнкі ці рэйтынг вучня.

***☎— Брэст, Вольга, маці 16-гадовага сына. Зараз, напэўна, усе дзеці захапляюцца камп'ютарам, засынаюць з мабільнікам... Так ці інакш узнікаюць пэўныя праблемы: і ў саміх дзяцей, калі гаварыць пра эфектыўнасць іх навучання ў школе, і ў нас, бацькоў, якія часта не могуць знайсці аргументаў для таго, каб скіраваць дзяцей на нейкія карысныя рэчы. Як трэба сябе паводзіць бацькам? Што забараняць?***

— Забараняць і вучыць трэба значна раней за 16 гадоў. Змагацца з залежнасцю, калі яна ўжо сфарміравалася, неверагодна цяжэй.

***☎— Віцебская вобласць, Аляўціна Мікалаеўна. Майму сыну зараз 13 гадоў. На шчасце, у нас поўная сям'я, аднак наш тата — чалавек па натуры вельмі мяккі і, як правіла, «строгая і прыдзірлівая» ў сям'і я. Таму ў мяне пытанне: якім чынам я павінна праводзіць размовы на далікатныя тэмы пра ўзаемаадносіны палоў і што рабіць, калі знаходзіш у кішэнях сына цыгарэты?***

— Па-першае, няхай растлумачэнні праводзіць бацька — праяўляе сябе як мужчына. Пра цыгарэты таксама можна пагаварыць, але калі дзіця даведаецца, што вы без папярэджання залезлі ў кішэню, ён вам верыць ужо не будзе. Проста абмяркуйце з сынам праблему курэння, а калі адчуеце пах, вось тады можна пагаварыць і больш дэталёва!

***☎— Асіповічы, Алена Іванаўна, настаўніца. Што трэба рабіць, калі ў класе ўзнікае праблема знікнення рэчаў, крадзяжоў? Звычайна настаўнік не хоча «выносіць смецце» за межы не тое што школы — класа. Якім чынам настаўнік можа правесці разбор, каб выявіць тых, хто гэтым займаецца? Якім чынам будаваць работу з бацькамі?***

— Калі мы нешта хаваем, замоўчваем, то толькі патураем сітуацыі, спрыяем ёй. Такія сітуацыі неабходна вырашаць усё ж такі з прыцягненнем міліцыі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

## ЯК СТАЦЬ ІДЭАЛЬНЫМ БАЦЬКАМ ДЛЯ ПАДЛЕТКА?

**1.** У сям'і, дзе ёсць падлетак, дарослы павінен выступаць то ў ролі вядучага, то ў ролі вядзёнага, то ў ролі аўтарытэта, то ў ролі «чайніка». Бацькі павінны пастаянна адаптавацца да змены сітуацыі і настрою, праяўляць гібкасць да меркавання і поглядаў ІНШАЙ асобы — уласнага дзіцяці.

**2.** Не камандуйце і не кіруйце! Ваша дзіця больш не верыць абстрактным словам і дэкларацыям, яно аналізуе вашы дзеянні, стратэгіі, статус.

**3.** Не толькі слухайце дзіця, але і назірайце за яго рэакцыямі. Задавайце сабе пытанні: «Чаму ён так (неадэкватна) рэагуе?». Паверце, дзіця не хоча змагацца, яно хацела б разабрацца.

**4.** Не плануйце канкрэтны вынік выхаваўчага ўздзеяння, ён усё роўна будзе іншым. Вы задумвалі адно, а атрымалася зусім іншае — радуйцеся. Дзіця пазбавіла вас яшчэ аднаго стэрэатыпу. Гэта спрыяе росту вашай асобы, правакуе спантаннасць рэакцый.

**5.** Не бойцеся рызыкаваць разам з падлеткам, здзіўляць яго. Пошук новых спосабаў узаемадзеяння з дзіцем хутчэй дапаможа пачаць гутарку на адной мове.

**6.** Перадавайце дзіцяці свой аптымізм. Шэраг змен, якія адбываюцца з падлеткам, успрымаюцца ім трагічна. Дапамажыце яму глядзець на любыя сітуацыі з лёгкай, аптымістычнай пазіцыі. Нельга жартаваць толькі з эмоцый.

**7.** Фільтруйце інфармацыю, якая датычыцца праблем падлеткавага ўзросту. Далёка не ўсё, пра што вы чытаеце, адносіцца менавіта да вашага дзіцяці. І не ўсё, што можа адбыцца з падлеткам, абавязкова адбудзецца менавіта з вашым дзіцtм.

**8.** Не забывайцеся на сямейныя каштоўнасці і традыцыі, якія існуюць у вашай сям'і. Менш дэкларуйце і больш паказвайце на сваім прыкладзе перавагі тых ці іншых каштоўнасцяў.

**9.** Падлетак імкнецца да адказнасці толькі там, дзе яна яму выгадная. Задача бацькоў — навучыцца дзяліцца сваёй адказнасцю з ім і ў іншых, малавыгадных, на першы погляд, абласцях. Дзіця павінна зразумець: усё, то адбываецца ў яго жыцці і жыцці яго сям'і, адбываецца не толькі дзякуючы дарослым, як гэта было ў раннім дзяцінстве, але і дзякуючы яго дзеянням.

**10.** Падлетак — не гліна, а бацькі — не скульптары. На жаль, дарослым не па сілах вылепіць ідэальнае дзіця, бо ў яго — іншае ідэальнае Я. Бацькі павінны толькі дапамагаць мяняцца і станавіцца дарослымі, зыходзячы з рэальных памкненняў.

**11.** Дапамагайце дзіцяці рабіць канкрэтныя крокі да яго мэт. Гэта важна для самавызначэння. Вядучая роля і адказнасць тут належаць яму, а дарослыя — толькі «аксакалы», здольныя падзяліцца ўласным досведам па запыце дзіцяці.

**12.** Вучыце не баяцца памылак. Паказвайце вопыт падзення і ўзлётаў на прыкладах з уласнага жыцця і жыцця іншых значных для дзіцяці людзей, а не на пастаянным «разборы яго палётаў».

**13**. Звярніце ўвагу падлетка на тое, што любому чалавеку ўласцівыя ўнутраная супярэчлівасць, неадназначнасць, канфлікт жаданняў і матываў паводзін. Пазіцыя «ўсе праз гэта праходзяць» значна менш уразлівая, больш абароненая, чым пазіцыя «я такі непаслядоўны».

**14**. Самапазнанне — прэрагатыва любога, хто думае і адчувае, незалежна ад узросту і статусу.

■ Пытальнік

## НА ЯКУЮ МЕДДАПАМОГУ РАЗЛІЧВАЦЬ, МАЮЧЫ ПАСВЕДЧАННЕ НА ПРАВА ЖЫХАРСТВА?

***Калі можна, дык хацелася б прачытаць тлумачэнні кампетэнтных органаў па наступным пытанні. Мая сваячка нарадзілася ў Беларусі. Выйшла замуж за ваеннага, ездзіла па ваенных гарадках СССР і за яго межы. Потым муж атрымаў прызначэнне ва Украіну, там атрымалі кватэру. Пасля развалу СССР ім давялося прыняць украінскае грамадзянства. Некалькі гадоў сваячка прыязджае даглядаць сваю хворую састарэлую маці. Зараз хоча аформіць пасведчанне на права жыхарства (па сямейных абставінах пакуль не можа канчаткова застацца). Нас цікавіць пытанне: маючы пасведчанне на права жыхарства, што яна можа атрымаць у плане медыцынскага абслугоўвання? Ці будзе якая бясплатная меддапамога ці ўсё застанецца платным?***

**Л.В. ПРАКАПОВІЧ,** *г.Жлобін.*

Адказ на запыт чытачкі рэдакцыя атрымала ва ўпраўленні аховы здароўя Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта.

«Медыцынская дапамога грамадзянам Украіны, якія маюць пасведчанне на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, аказваецца ў адпаведнасці з Пагадненнем, падпісаным главамі дзяржаў — удзельнікаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў (г. Масква, 17 сакавіка 1997 года).

На падставе Пагаднення, хуткая і неадкладная медыцынская дапамога (раптоўныя вострыя станы і захворванні, што пагражаюць жыццю хворага ці здароўю навакольных, няшчасныя выпадкі, атручэнні, траўмы, роды і неадкладныя станы ў перыяд цяжарнасці) аказваюцца на бясплатнай аснове.

З моманту, калі пагроза жыццю ліквідавана, аказанне медыцынскай дапамогі будзе весціся планава і на платнай аснове, па зацверджаных ва ўстановах аховы здароўя для замежных грамадзян з пасведчаннем на права жыхарства прэйскурантах».

■

## Не далі скрасці дубы

**Жыхар Бабруйска арганізаваў незаконную высечку дрэў і намагаўся вывезці з лесу ў Калінкавіцкім раёне драўніны на 30 мільёнаў рублёў, але быў затрыманы.**

«Лесаруб» паквапіўся на адну з самых каштоўных парод — на дуб. Іх было зрэзана больш за чатыры дзясяткі, прычым парушальніку спатрэбілася толькі ніжняя частка камля, а голле і астатняя драўніна пакідаліся.

Як расказаў галоўны ляснічы Калінкавіцкага лясгаса Аляксандр Русецкі, падчас планавага рэйду леснікі натрапілі на сляды ад колаў грузавіка, якія прывялі іх да месца высечкі, дзе якраз стаяў МАЗ з прычэпам. Людзі каля машыны казалі, што нічога не ведалі, бо іх толькі папрасілі перавезці зрэзаныя дрэвы. Тым не менш, у хуткім часе ўдалося знайсці таго, хто высечку арганізаваў. Як аказалася, ён ужо нават паспеў знайсці пакупнікоў на амаль скрадзеныя 60 кубаметраў драўніны .

Паводле інфармацыі УУС Гомельскага аблвыканкама, з пачатку года ў вобласці за парушэнне ляснога заканадаўства складзена каля 270 пратаколаў. Бабруйскаму «лесарубу», у прыватнасці, за дубы пагражае да 5 гадоў пазбаўлення волі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## І зноў — падзенне на рэйкі ў метро...

**Толькі на мінулым тыдні мы двойчы паведамлялі пра здарэнні ў сталічным метрапалітэне, калі на пуцях аказваліся людзі. Прычым тыя выпадкі адбыліся адзін за адным. І вось на гэтым тыдні — чарговае паведамленне на тую ж тэму.**

— Прыкладна а палове 23 гадзіны на станцыі «Усход» першай лініі метрапалітэна з платформы ўпаў на пуці непрацуючы мужчына 1978 года нараджэння, жыхар Мінска, — распавёў падрабязнасці здарэння старшы інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. — Праз тры хвіліны работнікі метрапалітэна дасталі пацярпелага на платформу. Спынення руху цягнікоў не было. Мяркуецца, што прычынай падзення стала асабістая неасцярожнасць: мужчына быў нападпітку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»**
**220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**

**режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 227 52 36, 226 03 01**

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2006 по 2011 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 76, д. 78, пр. Рокоссовского, 80, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 40, ул. Есенина, д. 42, ул. Есенина, д. 36, д. 38, ул. Матусевича, д. 52, д. 72, ул. Папанина, д. 18, ул. Стариновская, д. 2, ул. Колесникова, д. 16, д. 18, д. 20 и др.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 7 по генплану» в г. Минске.**

Свидетельство (удостоверение) № 500/1109-2650 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 09 ноября 2011 г.

Земельный участок площадью 0,3595 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано из шести секций. Количество жилых помещений жилого дома – 214. Серия жилого дома – 3А-ОПБ.

Начало строительства – май 2011 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – май 2012 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 20.12.2010 № 1491-60/10 с учетом изменений от 28.02.2012 г. № 88-60/12.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, по направлениям администраций районов г. Минска на строительство квартир с №1 по №136, №140, №141, №145, №146, №150, №151, №155, №156, №160, №161, №165, №166, №170, №171, №175, №176, №181, №182, №185, №186, №189, №190, №193, №194, №197, №198, №201, №202, №205, №206, №209, №210, №213, №214

и гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, на строительство квартир №137, №138, №139, №142, №143, №144, №147, №148, №149, №152, №153, №154, №157, №158, №159, №162, №163, №164, №167, №168, №169, №172, №173, №174, №177, №178, №179, №180, №183, №184, №187, №188, №191, №192, №195, №196, №199, №200, №203, №204, №207, №208, №211, №212.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с учетом выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 5 098 217 руб. – для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий; 7 770 575 руб. – для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 05.04.2011 № 55с-03-2011, генподрядчик – ОАО «МДК». Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с договором строительного подряда – май 2012 г.

Принятие и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве жилых помещений будет осуществляться через 7 календарных дней после опубликования проектной декларации в каб. 105, по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 13А.

**Генеральный директор Н.В. Милошевский**


## 11 МЕДЫЦЫНСКІХ РАБОТНІКАЎ СТАЛІ АХВЯРАМІ ПАЦЫЕНТАЎ І ІХ СВАЯКОЎ

Паводле інфармацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў аховы здароўя, за 2011 год у арганізацыях сістэмы Міністэрства аховы здароўя пацярпелі на вытворчасці 56 работнікаў галіны, пры гэтым два работнікі загінулі і 12 работнікаў атрымалі цяжкія траўмы. У 2010 годзе смяротных выпадкаў удалося пазбегнуць.

Асноўнай прычынай траўміравання работнікаў аховы здароўя застаюцца дарожна-транспартныя здарэнні. Прычым у абсалютнай большасці выпадкаў ДТЗ адбыліся па віне кіроўцаў старонніх арганізацый і ўладальнікаў асабістага аўтатранспарту. Другой па значнасці і колькасці пацярпелых прычынай вытворчага траўматызму з'яўляюцца супрацьпраўныя дзеянні іншых асоб — у першую чаргу, пацыентаў і іх сваякоў. Летась ад супрацьпраўных дзеянняў іншых асоб пацярпелі 11 работнікаў сістэмы аховы здароўя.

Таксама ў 2011 годзе адзначаўся рост колькасці і цяжкасці выяўленых прафесійных захворванняў. Так, 16 медыцынскіх работнікаў захварэлі на туберкулёз (у 2010 годзе — 11). Асаблівую заклапочанасць выклікае павышаны ўзровень вірусаносьбіцтва і захваральнасці медыцынскіх работнікаў, асабліва «групы рызыкі», гемакантактнымі інфекцыямі. За мінулы год сярод медыцынскіх работнікаў было зарэгістравана 330 новых выпадкаў захворвання і носьбіцтва маркераў парэнтэральных вірусных гепатытаў B і C і 15 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Салодкія падарункі для чатырох любых



**— Я сапраўды самы шчаслівы чалавек! — усміхаецца Аляксандр Загнёткін. Дома ў Слоніме яго чакаюць чатыры любыя жанчыны — маці Ірына, бабуля Людміла, жонка Кацярына і дачушка Дамініка. Іх Аляксандр і павіншаваў смачнымі тортцікамі, што прывёз з камандзіроўкі.**

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**

## Машэраў пачынаў раніцу са «Звязды»

Блізілася 60-годдзе «Звязды».

— Трэба, каб на ўрачыстым пасяджэнні выступіла тая дзяўчына з экіпажа экскаватара, якой ты прыз вазіў, — паклікаў да сябе галоўны рэдактар Аркадзь Апанасавіч Тоўсцік. — Падскоч яшчэ раз, пагавары, дапамажы скласці невялічкую, але ёмістую прамоўку.

І дадаў: «Май на ўвазе, будзе Пётр Міронавіч...».

Урачыстасць адбывалася ў зале Белдзяржфілармоніі. Без помпы, па даўно наезджаным сцэнары: даклад, прывітанні, канцэрт.

Перад самым пачаткам пасяджэння з'явіўся падцягнуты, быццам увесь адпрасаваны, мужчына. Папрасіў адно крэсла з левага боку ў радзе чацвёртым ці пятым не займаць. Мы зразумелі: ахоўнікі, будзе высокая асоба.

Калі пад'ехаў першы сакратар ЦК, ніхто і не заўважыў. У суправаджэнні рэдактара А.А. Тоўсціка ён выйшаў з-за куліс. Зала заапладзіравала. Пётр Міронавіч, высокі, элегантны, не па гадах стройны, спыніўся на сярэдзіне сцэны, запляскаў у адказ. Далоні вялікія, сялянскія, вочы, ад якіх густымі праменьчыкамі разбягаліся маршчынкі, лучыліся дабрынёй і прыязнасцю. Прыгожы твар свяціўся светлай, чыста машэраўскай усмешкай. Яе можна параўнаць хіба што з гагарынскай. Цягнуўся гэты рытуал не больш за паўхвіліны.

І вось далі слова «маёй экскаватаршчыцы». Гаварыла яна бойка, на добрай беларускай мове. У паперыну амаль не заглядвала. Пётр Міронавіч слухаў яе вельмі ўважліва, зрэдку пра нешта шаптаўся з рэдактарам. Як потым расказваў Аркадзь Апанасавіч, Машэраў быў у захапленні ад маладой палескай прыгажуні, яе нялёгкай працы. Тут ён не шкадаваў далоняў.

Сюжэт з урачыстасці прайшоў вечарам па беларускім тэлебачанні, справаздачу надрукавалі ўсе рэспубліканскія і абласныя газеты, дзе, вядома ж, не абмінулі прывітанне Пятра Міронавіча і дзяўчыны-меліяратара.

Потым, бываючы ў камандзіроўках у розных кутках краіны, людзі часта пыталіся: «Ці праўда, што Машэраў кожны рабочы дзень пачынае са «Звязды»?» — «А як жа, — адказваў без ценю сумнення, — заўсёды са «Звязды». Нават у выхадны!»

**Мікалай ШЛОМА,**
**Супрацоўнік «Звязды» 1973—1985 гг.**

## Нечаканы канфлікт

Побач з кансерваторыяй, на тым месцы, дзе сёння стаіць шыкоўны атэль «Еўропа», быў будынак старадаўняга, амаль трухлявага яўрэйскага тэатра.

Цяпер ужо і не памятаю, дзеля чаго я трапіў у гэты куточак Мінска менавіта ў той момант, калі вялізная чыгунная «груша» разбівала сцены будынка. З грукатам і пылам падалі буйныя кавалкі збудавання, якое ў далёкім мінулым было храмам Мельпамены. І вось на маіх вачах яму трэба было канцуць у Вечнасць. Вырашаю, што трэба зрабіць фотаздымак. Няхай будзе ў маім архіве, магчыма, калі-небудзь спатрэбіцца.

Выцягваю з сумкі фотаапарат і паспяваю адзін раз націснуць на кнопку. Раптам нехта за маёй спінай бесцырымонна пляскае далонню па плячы. Я ніяк не рэагую і працягваю трымаць фотаапарат на ўзроўні вачэй. Чакаю, каб зрабіць яшчэ адзін «дубль». Але ж нехта працягвае пляскаць па плячы.

— Прашу не замінаць! — кажу гэтыя словы, а сам сачу за рухам чыгуннай «грушы», каб націснуць на кнопку менавіта ў момант удару па сцяне.

— Грамадзянін! Перастаньце фатаграфаваць!

Я павярнуўся і ўбачыў перад сабой маладога сяржанта міліцыі, які вельмі рашуча яшчэ раз загадаў спыніць фатаграфаванне.

Я выцягнуў з кішэні рэдакцыйнае пасведчанне, назваўся і спытаў, чаму ён забараняе выконваць маю службовую справу. Далей адбыўся дыялог.

Сяржант: «Нельга! Забаронена!». Задаю пытанне: «Хто забараніў і па якой прычыне?».

Сяржант: «Асабіста я забараняю, таму што гэта фатаграфаваць нельга!».

Вакол нас літаральна за нейкую хвіліну сабраўся натоўп разявак. Нашага чалавека хлебам не кармі, толькі дай яму відовішча. Нейкая бабулька асабліва цікаўным паведаміла: «Шпіёна злавілі!».

Большага абсурду ў маім жыцці яшчэ не здаралася, і мне стала так смешна, быццам пачуў нейкі забаўны анекдот.

Мой смех падзейнічаў на сяржанта, як чырвоная ануча на быка, і ён рашуча загадаў: «Хопіць! Пайшлі ў райаддзел міліцыі, там разбяромся!».

Скажу шчыра: я ўзрадаваўся такому выпадку. Ёсць цудоўная магчымасць паказаць гэтаму заўзятаму сяржанту, дзе ракі зімуюць, і даць яму ўрок ветлівасці. Разумею, што ён прычапіўся без прычыны, але ж на вуліцы не буду яму тлумачыць, што ён робіць глупства. Усё гэта я скажу там, у кабінеце начальніка міліцыі.

Крочым бадзёра, плячом да пляча. Калі засталося метраў сто да будынка, кажу свайму канваіру: «Таварыш сяржант! Я не прадвеснік, зусім не валодаю магіяй, але дакладна ведаю, што будзе ў бліжэйшыя паўгадзіны ў райаддзеле міліцыі».

Сяржант: «Ну, дык што там будзе?».

— А будзе наступнае, — адказваю, — па-першае, вам загадаюць папрасіць у мяне прабачэння. Але гэта яшчэ не ўсе непрыемнасці для вас. Вам загадаюць даставіць мяне на машыне туды, адкуль забралі. І, нарэшце, дадуць вымову.

Сяржант спыніўся. Я зразумеў, што ён хоча адчапіцца ад мяне і думае, як гэта лепш зрабіць.

— Вось што, — пасля роздуму кажа сяржант, — у мяне шмат іншых спраў, больш важных, так што вы свабодны, я вас больш не затрымліваю.

Адказваю яму вельмі стрымана, спакойна, амаль ветліва: «Вялікі дзякуй! Вы мне сарвалі рэдакцыйнае заданне, зрабілі з мяне шпіёна, і цяпер я свабодны? Вы абяцалі разабрацца ў райаддзеле — вось там у кабінеце вашага начальства і разбяромся, хто з нас мае рацыю».

Мы як быццам памяняліся ролямі. Я энергічна ішоў уперад, а сяржант плёўся ззаду.

У кабінеце палкоўніка я даў волю сваім пачуццям. Палкоўнік хутка ўсё зразумеў.

— За тое, што я дрэнна выхаваў свайго падначаленага, — сказаў ён, — прашу ў вас прабачэння. Гэта першае. І другое: сяржант на машыне даставіць вас туды, адкуль забраў або ў любое іншае месца. А з табой, сяржант, будзе асобная размова.

Інцыдэнт быў вычарпаны. Я выйшаў на вуліцу. Услед за мной выбег сяржант, чырвоны, як спелы памідор.

— Куды вас даставіць? — пытае.

— Пайду пяшком, — адказваю, — аднак як дакладна збылося маё прадказанне, ці не так, таварыш сяржант?

— Усё так. З прэсай трэба дружыць. Я вельмі шкадую, што праявіў непатрэбную стараннасць і шчыра прашу ў вас прабачэння, — сказаў сяржант, і мы развіталіся спакойна і мірна, быццам і не было аніякага канфлікту.

**Мікалай АМЕЛЬЧАНКА,**
**былы фотакар «Звязды».**

## АЎТОБУСЫ ПОЙДУЦЬ ПА РЭЙКАХ

**Закупіць новыя рэйкавыя аўтобусы збіраюцца ў Магілёўскім аддзяленні Беларускай чыгункі.**

Гэтая навінка беларускай вытворчасці цяпер праходзіць выпрабаванні. Мяркуецца, што рэйкавыя аўтобусы заменяць дызельныя цягнікі на ўчастках, дзе не самы вялікі пасажырапаток. Яны больш эканамічныя: паліва патрабуецца ў некалькі разоў менш. Да таго ж, яны камфортныя для пасажыраў і маюць сучасны выгляд. У Магілёўскай вобласці рэйкавыя аўтобусы плануюць закупіць сёлета альбо на пачатку наступнага года і выкарыстоўваць іх на чыгуначных маршрутах у Крычаўскім і Асіповіцкім кірунках.

**Ілона ІВАНОВА**.


24 марта 2012 года в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров **ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма».**

**Повестка дня:**

1. О сделках Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13. Начало регистрации участников собрания: 10.30.

*УНП 200295587*

Утерянный бланк строгой отчетности «Страховой полис обязательного медицинского страхования иностранных граждан» формы 2РН серии БВН, в количестве 1 штуки № 0097211 Филиала Белгосстраха по Минской области считать недействительным.

*УНН 600013344*

**Изменения в проектную декларацию** по объекту «Многоэтажный жилой дом со встроенными объектами торгово-общественного назначения и многоуровневой гараж-стоянкой № 3 по генплану по пр. Дзержинского в границах пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожной – пер. Разинского – пер. 1-го Извозного» (1-я очередь, без строительства ТП №40.6 по генплану), опубликованную в газете «Звязда» 17.12.2011 года, газете «Рэспубліка» 25 ноября 2011 года.

**Застройщик:** Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, проспект Победителей, дом 89, корпус 2, помещение 10, каб. 18, 41. **Тел. 8 (017) 216 00 09.**

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 1-, 2-, 3-, 4-комнатные квартиры и встроенные помещения административного, торгово-общественного назначения для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц.**

Стоимость 1 кв.м. 1(одно)-комнатных и 2(двух)-комнатных квартир эквивалентна 1 300 (одной тысяче тремстам) долларам США.

Стоимость 1 кв.м. 3(трех)-комнатных и 4(четырех)-комнатных квартир эквивалентна 1 200 (одной тысяче двумстам) долларам США.

Стоимость 1 кв.метра встроенных помещений административного, торгово-общественного назначения эквивалентна 2 300 (двум тысячам тремстам) долларам США.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

### Организатор аукциона – Березинский районный исполнительный комитет

| № лота | Местоположение земельного участка, кадастровый номер | Срок аренды, лет | Площадь земельного участка | Назначение земельного участка | Условия продажи | Расходы, связанные с проведением аукциона | Начальная цена объекта, доллар США по курсу НБ РБ на дату принятия решения | Сумма задатка, доллар США по курсу НБ РБ на дату принятия решения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Минская область, г. Березино, ул. Мультана, д. 62А 620450100001003152 | 50 | 0,4859 | для строительства цеха заморозки плодово-ягодной продукции и склада-холодильника | - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;<br>- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона на р/с 3602611000202 ЦБУ № 602 филиала № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Борисов, код 810, код платежа 04616; расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ будут определены на основании счета-фактуры;<br>- заключение победителем аукциона с Березинским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года.<br>Обязательное условие аукциона – регистрация предприятия в Березинском районе. | 5380067 в т.ч.: 119000 – за гос. регистрацию; 5226067 – за выполнен. работы по формированию зем. участка, 35000 – госпошлина | 10782,9 | 1078,29 |

1. **Аукцион состоится 17 апреля 2012 года в 10.00 в зале заседаний Березинского райисполкома по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, 18.**

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, 18, 2-й этаж, кабинет № 18 с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

3. Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

